Пролетарыі ўсіх краіў, злучайцеся!

Нядзеля, 10 красавіка 1938 г., № 20 (362)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

БОЛЬШ ДАПАМОГІ МАЛАДЫМ КАДРАМ

У нашай квітнеючай Краіне соцыялізма—неабмежаваныя магчымасці, шырачэзныя перспектывы для росту і росквіту здольнасцей і талентаў.

У капіталістычных краінах мільёны працоўных перажываюць трагедыю голаду, роспачы і пагрозы вайны. І ў гэтых мільённых арміях беспрацоўных жабрацкае жыццё вядуць тысячы, сотні тысяч інтэлігентаў. Вуліцы Варшавы, Кракава, Вены, Парыжа, Берліна перапоўнены выкінутымі за борт жыцця працаўнікамі культуры. Прафесары прадаюць запалкі, мастакі за мізэрную плату прапаноўваюць купіць іх карціны, артысты, музыканты, кампазітары ходзяць групамі з двара ў двор, жабрацка працягваючы пад акампанімент гітары пакамечаныя капелюшы, ловячы рэдка кінутую з вакна плату за ігру і спеў — дробную манету. Разам з беспрацоўнай масай рабочых выстойваюць інтэлігенты ў доўгіх чаргах за талеркай вадзянага, рэдкага супу.

У Польшчы нярэдка можна бачыць на брамах надпісы аб тым, што «жабракам, валацугам і музыкантам уваход забаронен». Дзікая грымаса капіталістычнага свету! Валацуга, жабрак і галодны інтэлігент-музыкант мераюцца адной меркай — непатрэбныя людзі.

Капіталістычны свет не клапоціцца аб падтрыманні і выхоўванні талентаў. Рэдка выскачыўшыя «зоркі» экрана ці сцэны хутка гаснуць, не знаходзячы магчымасцей для праяўлення сваіх талентаў, і часцей за ўсё паміраюць у беднасці і адзіноце, як і мільёны работнікаў фізічнай працы. У фашысцкіх краінах падаўлены таленты. Там звязаны розумы і рукі.

Толькі наша Краіна Советаў можа і ўмее цаніць таленты, выхоўваць сотні і тысячы здольных людзей ва ўсіх галінах чалавечай дзейнасці. Сагрэтыя бацькоўскімі сталінскімі клопатамі, людзі нашай краіны, незалежна ад іх прафесіі і спецыяльнасцей, праяўляюць свае здольнасці ва ўсіх сферах гаспадарчага і культурнага жыцця. Знатнымі людзьмі становяцца забойшчыкі і вучоныя, металісты і пісьменнікі, ткачы і артысты, пастухі і кампазітары. Сотні ордэнаносцаў і знатных людзей знаходзяцца сярод інтэлігенцыі. Работа лепшых пісьменнікаў, артыстаў, кампазітараў, музыкантаў і мастакоў высока ацэнена совецкім урадам. Нямалую частку сярод узнагароджаных вышэйшай адзнакай — ордэнамі — складае наша совецкая, шчаслівая моладзь.

Совецкая Беларусь, як неадрыўная частка Вялікага Совецкага Саюза, мае нямала маладых даравітых работнікаў культурнага фронта. Наша совецкая моладзь, поўнасцю аддааая справе партыі Леніна—Сталіна, прагна ловіць кожнае слова вучобы, яна авалодвае вышынямі літаратуры, музыкі, жывапісу, праяўляе свае здольнасці, свае таленты.

Рэдакцыі газет, раённых і цэнтральных, атрымліваюць штодня нямалую колькасць вершаў і апавяданняў, у тэатры і ў кансерваторыю паступае нямала заяў аб жаданні вучыцца музыцы і тэатральнаму мастацтву. На мастацкіх выстаўках усё часцей і часцей з'яўляюцца палотны і скульптуры маладых даравітых мастакоў. Значная колькасць здольнай моладзі стала працуе ў літаратуры, тэатры, жывапісу. Больш паловы членаў і кандыдатаў Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі і Саюза совецкіх мастакоў Беларусі — гэта моладзь. Тэатры нашы ў пераважнай большасці ўкамплектаваны маладымі акторамі і рэжысёрамі.

Але неабходна сцвердзіць і тое, што, не гледзячы на значныя поспехі ў гэтай галіне, работа з маладымі кадрамі праводзіцца ўсё-ж яшчэ недастатковая. Сёння мы змяшчаем матэрыялы з Віцебскага Дзяржаўнага драматычнага тэатра, якія паказваюць, што ў гэтым тэатры няма належнай работы з маладымі акторамі і рэжысёрамі. Становішча гэтага тэатра ў справе выхавання і вылучэння маладых актораў з'яўляецца тыповым для большасці тэатраў БССР. Маладыя акторы часта пастаўлены ў такое становішча, што не могуць спрабаваць сваіх здольнасцей у цікавых і важных ролях.

Няма таксама належнай увагі і справе арганізацыі студыйнай падрыхтоўкі тэатральных кадраў. Няма яшчэ належнага творчага кіраўніцтва нашымі новымі маладымі калгасна-соўгаснымі тэатрамі.

Балай, яшчэ горшае становішча ў арганізацыі мастакоў Беларусі. Пераважная большасць членаў гэтага саюза маюць толькі сярэднюю мастацкую асвету. Па сканчэнні Віцебскага вучылішча яны патрабуюць далейшай падрыхтоўкі. У БССР няма такой установы, дзе-б маладыя мастакі і скульптары маглі прадоўжваць сваю вучобу, удасканальваць майстэрства. Адсутнасць мастацкай крытыкі яшчэ больш пагаршае справу. Маладыя мастакі прадастаўлены самім сабе. Аргкамітэт саюза мастакоў і Упраўленне па справах мастацтваў фактычна нічым не дапамагаюць ім. Нават творчыя экскурсіі ў братнія рэспублікі, дзе наша моладзь магла-б многаму навучыцца, не арганізоўваюцца.

А як абстаіць справа на літаратурным участку? Працуе габінет маладога аўтара. Моладзь вучыцца, бярэцца ўсё часцей і часцей за вялікія палотны, але і тут з боку крытыкі не заўсёды бываюць неабходныя аб'ектыўныя дзелавыя ўказанні і падтрымка. Праўленнем Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі слаба яшчэ праводзіцца работа над рукапісамі маладога аўтара.

Партыя Леніна—Сталіна, Совецкі ўрад умеюць выхоўваць і цаніць нашы маладыя кадры. Совецкая краіна дае шырачэзныя магчымасці для росквіту і росту маладых талентаў. Справа толькі за тым, каб на тых канкрэтных участках, дзе спрабуе свае сілы наша моладзь, ёй была аказана значна большая дапамога, таварыскае падтрыманне. І тады мы будзем мець усё новае і новае выяўленне талентаў.

Агульнавядома, што апрача школ, студый, дзе набываюцца веды і тэорыя, неабходна самастойная работа над словам, сюжэтам, вобразамі, над кампазіцыяй, фарбамі. Тут патрэбна дапамога старэйшых, вопытнейшых таварышоў, працуючых у літаратуры, тэатры і мастацтве.

Здаровая, не аднабокая крытыка ў літаратуры, азнаямленне з творчымі дасягненнямі братніх рэспублік і далейшая творчая вучоба сярод мастакоў, смялейшае вылучэнне маладых, здольных тэатральных сіл на адказную творчую работу на сцэне, — вось што патрэбна нашай моладзі, працуючай на гэтых участках культурнага фронта.

Вл. Маякоўскі

ДЗЕСЯЦІГОДНЯЯ ПЕСНЯ

Дрэнь адміральская —
пан
і барон —
лезлі з шаснаццаці
розных старон.
Зброя
французская,
англійскі танк.
Белым
татуля —
Антантавы стан.
Край наш
змагаўся
ў коле блакад,
дні
грукаталі
громам гранат.
Не для разбою
ішлі мы ў паход,
дружна
баронім
палі
і завод.
Крочылі з вёсак,
выходзілі з шахт,
біліся
смела
у рвані
й вашах.
Шэрыя шлёмы
з яркай звяздой
белай араве
крыкнулі:
— Стой!
Білі Дзенікіна,
білі —
Махно, —
кожнага
з шляху
таксама змахнём.
Луснуў,
надломаны,
Крыма хрыбет.
Сіла
Чырвонай
расла ў барацьбе.
З вамі
зліваліся
ў дымных палях
сэрца
рабочых,
сэрца
сялян.
З першай трывогаю —
Толькі пакліч, —
стомільённыя
выйдзем на кліч.
Дол патрасаючы,
ў новы паход
рушаць
дывізіі
нашых пяхот.
Помнячы
словы
чырвоных прысяг,
лава
Будзённых
адправіцца ў шлях.
Толькі
буржуі
к нам кінуць палкі —
птахі
чырвоныя
зоймуць блакіт.
Моцна
гартуйся
у бітвах вякоў,
слаўная
армія
бальшавікоў!

Пераклад Міх. КАЛАЧЫНСКАГА.

ДЭКАДА АЗЕРБАЙДЖАНСКАГА МАСТАЦТВА Ў МАСКВЕ



УДЗЕЛЬНІКІ ДЭКАДЫ АЗЕРБАЙДЖАНСКАГА МАСТАЦТВА. НА ЗДЫМКАХ (злева направа): заслужаны артыст АзССР ІДАЯТ - ЗАДЭ, пастаноўшчык оперы «Кёр-Оглы», дырыжор Дзяржаўнага азербайджанскага тэатра оперы і балета АШРАФ ГАСАНАЎ, мастак тэатра Б. А. МУСТАФАЕЎ, заслужаны артыст АзССР БЮЛЬ-БЮЛЬ.

НА АДКРЫЦЦІ ДЭКАДЫ ПРЫСУТНІЧАЛІ ТАВАРЫШЫ І. В. СТАЛІН, В. М. МОЛАТАЎ, Л. М. КАГАНОВІЧ, А. А. ЖДАНАЎ

Спектаклем Дзяржаўнага тэатра оперы і балета імя М. Ф. Ахундава—операй «Кёр-Оглы» кампазітара народнага артыста АзССР Уз. Гаджыбекава адкрылася 5 красавіка дэкада азербайджанскага мастацтва ў Маскве.

У вобразе Кёр-Оглы ўвасоблены лепшыя рысы народнага характару. Азербайджанскі віцязь Кёр-Оглы мужна змагаецца з ворагамі, ніколі не ведае страху, ніколі не хлусіць, ён — абаронца ўсіх прыгнечаных, гроза ўсіх прыгнятальнікаў. Гэты цудоўны вобраз народнага героя, які паводле падання жыў у XVI стагоддзі, з'явіўся цэнтральным персанажам оперы Узеіра Гаджыбекава. У оперы «Кёр-Оглы» Уз. Гаджыбекаў вырашыў надзвычай складаную і пачэсную задачу: на аснове дасягненняў сучаснай музыкальнай культуры ён стварыў нацыянальную азербайджанскую оперу, прасякнутую народнай паэзіяй і музыкай.

Пастаноўшчык спектакля заслужаны артыст АзССР Ідаят-задэ, дырыжор Ашраф Гасанаў, мастак Мустафаеў, балетмейстары Кеваркоў і Вронскі разам з усім калектывам тэатра стварылі спектакль, які сведчыць аб цудоўным творчым уздыме і росквіце мастацтва Азербайджана.

Бліскучыя вобразы азербайджанскага народнага эпасу аб Кёр-Оглы з вялікай глыбінёй увасоблены ў музыцы гэтай выдатнай па ідэйнаму зместу оперы.

Асаблівым поспехам карысталіся ў гледача артыстка Кнарык Грыгаран, якая цудоўна выконвала ролю Нігяр, і заслужаны артыст АзССР Бюль-Бюль у ролі Кёр-Оглы. Вялікае ўражанне пакінулі масавыя сцэны і народныя пляскі. Вялікі поспех мела выступленне салісткі балета Гамэр Алмаз-Задэ.

На адкрыцці дэкады — у філіяле Дзяржаўнага ордэна Леніна Акадэмічнага Вялікага тэатра Саюза ССР — на спектаклі «Кёр-Оглы» прысутнічалі таварышы **І. В. Сталін, В. М. Молатаў, Л. М. Кагановіч, А. А. Жданаў.**

Пасля паказу оперы таварыш Сталін і кіраўнікі партыі і ўрада разам з усімі гледачамі горача віталі ўдзельнікаў спектакля.

6 красавіка — на другі дзень дэкады — у філіяле Дзяржаўнага ордэна Леніна Акадэмічнага Вялікага тэатра Саюза ССР была зноў паказана опера «Кёр-Оглы». Спектакль прайшоў, як і напярэдадні, з вялікім поспехам. Зала тэатра была перапоўнена. Гледачы гарачымі воплескамі віталі калектыў оперы і асобных выканаўцаў.

***

Увечары 7 красавіка ў філіяле Дзяржаўнага ордэна Леніна Акадэмічнага Вялікага тэатра СССР адбыўся трэці спектакль. Азербайджанскі Дзяржаўны тэатр оперы і балета паказаў у гэты дзень прэм'еру оперы народнага артыста РСФСР, АзССР і УзССР Р. М. Гліэра «Шах-Сенем».

Сярод легенд і паданняў азербайджанскага народа казка аб самаадданым каханні Гарыба і Шах-Сенем — адна з самых цудоўных і паэтычных. Кампазітар Р. Гліэр глыбока і сур'ёзна вывучыў самабытнае мастацтва азербайджанскага народа. Выдатны народны спявак-ханендэ Джаббар Кар'ягды і буйны азербайджанскі тарыст Курбан Прымаў дапамаглі Р. Гліэру сабраць і запісаць каштоўнейшы музыкальна-фальклорны матэрыял. Шмат цудоўных песенных мелодый паведамілі кампазітару і першыя выканаўцы галоўных партый оперы — народная артыстка Шэўкет ханум Мамедава (Шах-Сенем) і заслужаны артыст Бюль-Бюль (Гарыб). Дапамог кампазітару і аўтар азербайджанскага тэксту оперы таленавіты паэт і драматург Джаффар Джабарлы.

Захаваўшы агульны «казачны» каларыт оперы, рэжысёр А. Іскендэраў, мастакі М. Сагіян (дэкарацыі) і Г. Халыкоў (касцюмы) надалі спектаклю канкрэтнасць гістарычна склаўшагася стылю азербайджанскага мастацтва XVI века. У оперы з вялікім талентам і ўменнем раскрыты выдатныя багацці азербайджанскага народнага мастацтва.

Спектакль меў надзвычай вялікі поспех у гледачоў.

Квітнее мастацтва азербайджанскага народа

Гутарка з заслужаным артыстам АзССР ордэнаносцам тав. Бюль-Бюль

Рост вакальна-музыкальнай культуры Азербайджана супадае з агульным ростам нашай шчаслівай краіны.

Выключныя клопаты партыі і ўрада стварылі ўмовы для росту нацыянальных кадраў ва ўсіх галінах мастацтва. За дваццаць год выраслі і выхаваны кадры выканаўцаў, кампазітараў, мастакоў, музыкантаў.

У Азербайджане да яго советызацыі ўсякае праяўленне сапраўднага народнага мастацтва заглушалася ў самым зародку ханамі, баямі і муламі.

Багацейшы фальклор у галіне музыкальнай творчасці, вусных паданняў, такі шматгранны і багаты, быў у загоне.

Не ў інтарэсах мусаватыстаў і іншых буржуазных нацыяналістаў развіваць сапраўдную народную творчасць. Бо народ, які сапраўды праўдзіва і рашуча пратэставаў супроць гнёту заваяўнікаў, народ, які любіць прыроду, любіць прастату, любіць свабодную творчую працу, — гаворыць аб гэтым магутным голасам у сваёй творчасці.

Таму не выпадкова бекі, ханы і мулы не давалі развівацца народнай творчасці. І толькі ў Совецкім Азербайджане, сагрэтае клопатамі партыі і ўрада, народнае мастацтва расквітнела як ніколі.

У творчасці нашага народа можна адрозніваць: творчасць ашугаў, творчасць ханандэ — спевакоў-імправізатараў і творчасць народных музыкантаў.

У сэнсе захавання вакальнай культуры, нацыянальнага каларыту і закончанасці формы першае месца займае мастацтва ашугаў.

Азербайджанскі народ заўсёды змагаўся супроць варожых яму ўплываў. Гэта, зразумела, адбілася і на вуснай народнай творчасці, і на музыкальных творах народа.

Народ, пазбаўлены друкаванага слова, паэты якога ў большасці сваёй былі непісьменныя, стварыў цудоўныя ўзоры паэм, арыгінальныя і каларытныя.

Дэкада азербайджанскага мастацтва ў Маскве паказвае, як бурна ішло развіццё мастацтва нашага народа.

Чатыры спектаклі, якія ўключаны ў праграму дэкады, — гэта лепшае з таго, чаго дасягнулі мы ў гэтай галіне. Акрамя трох оперных тэатраў і аднаго тэатра музкамедыі, у дэкадзе прыме ўдзел рад калектываў, створаных з таленавітых прадстаўнікоў народа. Гэта—аркестр народных інструментаў, ансамбль народных танцаў, вялікі хор і прадстаўнікі ўсіх відаў народнага мастацтва.

Варта адзначыць адну важную асаблівасць у рабоце гэтых калектываў: творчыя ансамблі, створаныя з таленавітых рабочых, калгаснікаў, цяпер не толькі і столькі этнаграфічныя ансамблі—усе ўдзельнікі яго, уключаючы выканаўцаў народных песень і інш., з'яўляюцца вучнямі совецкіх музыкальных навучальных устаноў, усе атрымалі музыкальную адукацыю і кожны ў сваёй галіне з'яўляецца майстрам сваёй справы.

Мы маем таленавітых рэжысёраў, як Ідаят-задэ, заслужаны артыст АзССР, пастаноўшчык оперы «Кёр-Оглы»; Адыль Іскендэраў—пастаноўшчык оперы «Шах-Сенем»; дырыжораў, як Ашраф Гасанаў, Сеід Рустамаў, мастакоў—Гасана Мустафаева, ордэнаносца Рустана Мустафаева, Ісмама Ахундава і багата маладых, растучых і шматабяцаючых работнікаў ва ўсіх галінах мастацтва.

Азербайджанскі тэатр выхаваў свае кадры — ад суфлёра да дырыжора і кампазітара. І мы — радавыя работнікі нашага мастацтва — ганарымся поспехамі ўсяго нашага калектыва.

Буржуазныя нацыяналісты, ворагі нашага народа імкнуліся давесці, што мастацтва Азербайджана, яго музыкальная творчасць, песні яго ашугаў—чуждыя мастацтву другіх народаў Совецкага Саюза, што гэта творчасць пазбаўлена ўсякай сувязі з еўрапейскай музыкальнай культурай. Яны імкнуліся давесці, што наша народная музыка не можа быць запісана па сістэме еўрапейскага нотнага пісьма і інш. Усё гэта рабілася з мэтай затармазіць развіццё народнага мастацтва, пазбавіць яго багатых перспектыў далейшага росквіту.

Насуперак варожым падкопам развіццё мастацтва Совецкага Азербайджана пайшло па правільнаму шляху, па шляху асваення музыкальнай культуры, па шляху далейшага ўдасканалення.

Сярод нашых артыстаў многія майстры ў галіне выканання народных твораў працуюць і ў галіне асваення твораў еўрапейскай музыкальнай культуры. Так, Шэўкет ханум Мамедава спявала ў «Рыгалета» арыю Джыльды, спявала у «Травіяце», у «Севільскім цырульніку», Гюлара — у «Травіяце», Якуб Рызаеў—у «Паяцах» і інш. Рад нашых маладых актораў здольны ўжо выступаць у еўрапейскіх операх.

Гэта сур'ёзнае наша дасягненне, гэта ўзбагачае наша майстэрства ў галіне выканання твораў народнай творчасці, якую мы глыбока і шчыра любім.

Перад выканаўцам у нашай оперы стаіць цяжкая, але пачэсная задача: выканаўца, выступаючы ў оперы, павінен валодаць агульнай вакальнай тэхнікай і таксама глыбока разумець каларыт і стыль выканання нацыянальных матываў.

Народныя мелодыі пабудаваны вельмі своеасабліва, са складанымі пасажамі, і часта нізкім голасам прыходзіцца выконваць уверцюры, цяжкія для выканання нават сапрана.

Гэтыя цяжкасці знаходзяць сваё адлюстраванне і ў тых операх, якія ўключаны ў праграму дэкады.

Выконваючы ролю Кёр-Оглы ў оперы гэтай-жа назвы, мне даводзіцца пераходзіць ад звычайнага ў нашым уяўленні выканання да імправізацыі сапраўды народнага песняра-ашуга.

Кампазітар Узеір Гаджыбекаў у сваёй оперы шырока выкарыстаў народныя матывы, уся опера прасякнута глыбока зразуметай, прачутай народнай музыкай і адначасова кампазітар узняў мастацтва оперы да ўзроўню лепшых твораў опернага мастацтва.

Я лічу сваёй пачэснай задачай садзейнічаць поспеху нашай нацыянальнай оперы, якая настолькі ярка і пераканаўча сведчыць аб росце мастацтва Совецкага Азербайджана.

Мой шлях да выканання партыі Кёр-Оглы я пачаў у Совецкім Азербайджане. Вучыўся я ў чырвонай Маскве, паступіўшы ў Кансерваторыю ў клас праф. Палякова ў 1921 годзе. Я прышоў у Кансерваторыю, — гаворыць тав. Бюль-Бюль, — зусім не маючы ўяўлення аб еўрапейскай музыкальнай культуры. Мне было цяжка ўлавіць гучанне піяніна, мне было незнаёмым еўрапейскае гукапераймание.

Маё знаёмства з рускай операй пераканала мяне ў неабходнасці ўпартай і сур'ёзнай вучобы. Пачатак быў нялёгкім. Праф. Паляноў, Сперанскі сцвярджалі, што пры маім спецыфічным голасе нічога не выйдзе. Але тут да любві к мастацтву далучылася ўпартасць і настойлівасць, тая настойлівасць, якой я навучыўся ў бальшэвіцкай партыі.

Я вырашыў прадоўжваць пачатую справу.

Совецкі ўрад камандыраваў мяне ў Італію для ўдасканальвання. Час, праведзены ў Італіі, я правёў за вывучэннем гісторыі вакальнай культуры ў Еўропе, скарыстаў для сур'ёзнай і настойлівай вучобы.

Па звароце на радзіму ў 1931 годзе прада мной стала сур'ёзная задача—падаць багацейшыя творы майго народа ў больш культурнай ў выканаўчым сэнсе форме, захаваўшы як самае каштоўнае ў іх — іх цудоўную свежасць і нацыянальны каларыт, і побач з гэтым паказаць узоры еўрапейскай вакальнай культуры.

К гэтаму часу адносяцца мае выступленні ў «Рыгалета» — у партыі герцага на італьянскай і азербайджанскай мовах, у оперы «Тоска» — Каварадосі і ў радзе партый, пабудаваных на ўзорах народнай творчасці.

Выкананню гэтай задачы я падпарадкаваў і сваё выступленне на ўсесаюзным конкурсе выканаўцаў, дзе побач з лепшымі творамі народнага мастацтва я выконваў творы еўрапейскага і совецкага музыкальнага мастацтва.

Удзел у дэкадзе азербайджанскага мастацтва ў Маскве — магчымасць паказаць сваё мастацтва ў сталіцы Вялікага Саюза — найвялікшая ўзнагарода для мяне і такі-ж вялікі абавязак.

Наш народ любіць спяваць, любіць іграць. Ва ўсіх кутках нашай краіны ёсць самадзейныя музычныя і харавыя калектывы. Гэта—рэзерв талентаў, гэта магутны рэзерв, з якога наша мастацтва чэрпае ўсё новыя і новыя сілы.

Мне радасна наглядаць поспехі маіх маладых таварышаў.

Нашы выступленні ў часе дэкады—гэта дэманстрацыя адзінства народаў Совецкага Саюза, адзінства думкі і пачуццяў.

Я карыстаюся магчымасцю перадаць прывітанне народам Совецкай Беларусі, будуючым сваё шчаслівае жыццё ў дружнай сям'і народаў Совецкага Саюза.

Масква, 8 красавіка. (Наш. кар.).

ПАЭМА ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ „ФЕЛІКС ДЗЕРЖЫНСКІ“

Распрацоўка вобразаў, манера пісьма Э. Агняцвет выдае нахіл паэтэсы, імкненне да шырокага паказу рэчаіснасці, да шырокіх палотнаў. Праўда, паэтэса ўлічвае свае маладыя сілы і стрымлівае сябе. Гэта відаць і ў вершы пра Леніна, і ў вершы «Марцін», і ў вершы «Не спіць дазорны». Гэта імкненне знайшло сваё лагічнае ўвасабленне ў паэме пра Фелікса Эдмундавіча Дзержынскага.

Тут перш-на-перш хочацца адзначыць своечасовасць выхаду гэтай паэмы. Абвастрэнне класавай барацьбы ў краіне, выклікане шалёным супраціўленнем ліквідацыі рэштак капіталізма з боку захаваўшыхся яшчэ яго прыхільнікаў і слуг, выклікае ў памяці савецкага чалавека вобразы жорсткіх баёў з ворагамі рэвалюцыі ў першыя часы рэвалюцыі, уваскрашае герояў гэтага перыяду, якія непахісна і самаадданa змагаліся супроць ворагаў. Сярод гэтых герояў адно з найбольш пачэсных месц належыць «мечу рэвалюцыи» — Ф. Э. Дзержынскаму. Спрабаваць стварыць вобраз Дзержынскага ў літаратурным творы — гэта азначала актыўна дапамагчы партыі ў яе барацьбе з ворагамі, актыўна ўключыцца паэтычнымі сродкамі ў рэалізацыю лозунга пра большэвіцкую пільнасць. Відаць, гэта жаданне прымусіла тав. Агняцвет паскорыць выхад у свет сваёй паэмы, што ў сваю чаргу не дало магчымасці дапрацаваць усе часткі яе і таму некаторыя з іх аказаліся некалькі сыраватымі і слабымі. Праўда, гэта датычыць меншай часткі паэмы, у прыватнасці, — паказу падпольнага схода, сцэны ў турме (яе сярэдняй часткі), біяграфічнай даведкі ў канцы трэцяга раздзелу паэмы.

Адзінаццаць гадоў ён пражыў,
Ненавісным астрогам закуты,
І з выгнання ён тройчы бяжыць,
Разрываючы душныя путы.
Ён працоўных на бой падымаў,
Поўны веры вялікай і яснай,
І ні разу ён духам не паў,
І ні разу надзея не згасла.
Хоць гарэў у ім вершаў агонь,
Не пісаў больш паэм гераічных,
Самай лепшай паэмай яго
Стаў упэўнены бой за Кастрычнік.

Дарэчы, пяць строф гэтай даведкі, як відаць, з'яўляюцца намёткай яшчэ ненапісаных раздзелаў паэмы. Мы толькі-б віталі паяўленне гэтых раздзелаў, бо гэта-б дало магчымасць тав. Агняцвет дарысаваць партрэт Дзержынскага, зрабіць яго больш поўным.

Я не згодзен са сцвярджэннем раду таварышоў, у тым ліку тав. Глебкі, што патрэбна абавязкова даць усе эпізоды з жыцця тав. Дзержынскага. На гэта не хапіла-б некалькіх томаў. Маю думку падмацоўвае паяўленне паэмы тав. Далматоўскага пра Ф. Э. Дзержынскага (журнал «Знамя» № 2 за 1938 год), у якой паэт узяў якраз раздзелы, якія адсутнічаюць у Агняцвет, і ўсё-ж не даў вобраза Дзержынскага. Выбар эпізодаў, як і выбар тэмы, мае сваё значэнне, але настойліва раіць яго як гарантыю поспеху — больш чым памылкова.

Не згодзен я таксама ні з тонам, ні з вывадамі тав. Глебкі. І тон і вывады робяць тэмы пра вялікіх людзей нашай краіны забароненымі для маладых пісьменнікаў: маўляў, няма чаго брацца, усё адно не справішся. Вопыт братняй рускай літаратуры, дзе многія выдатныя кнігі напісаны маладымі пісьменнікамі, даводзіць, што вывады тав. Глебкі не толькі прынцыпова няправільныя, але і практычна абвергнуты. Замест аб'ектыўнага разгляду паэмы ў тав. Глебкі атрымалася, хацеў ён таго ці не хацеў, рагатка на шляху росту маладых пісьменнікаў. Здарылася так таму, што ўмоцнена мусіруючы два-тры сапраўды вельмі слабыя месцы ў паэме і нанізваючы, як пацеркі на нітку, асобныя няўдалыя (а часам і зусім цярпімыя) словы і выразы, тав. Глебка ўпэўніваецца сам і спрабуе ўпэўніць чытача, што паэма Э. Агняцвет нічога не варта і калі і з'яўляецца «крокам наперад», дык толькі для самой паэтэсы. Апошні рэверанс з'яўляецца, зразумела, дыпламатычным ходам і каштоўнасці не мае.

Зразумела, было-б дзіка сцвярджаць, што тав. Агняцвет вычарпала тэму пра Дзержынскага, што яна дала яркі партрэт мужнага рыцара рэвалюцыі, што ў яе паэме няма істотных недахопаў. Паэму пісаў малады паэт, які не завяршыў свайго фарміравання, які не ўдасканаліў свайго майстэрства, але які безумоўна з поспехам расце і вучыцца. У паэме шмат слоўных «аграхаў», якія пры большай уважлівасці Э. Агняцвет магла-б выправіць. У паэме ёсць рад зусім слабых мясцін, якія патрэбна перапісаць нанава, рад мясцін, якія патрабуюць развіцця думкі, пашырэння паказу вобраза Дзержынскага. У самой біяграфіі Дзержынскага ёсць эпізоды, якія вельмі пажадана было-б бачыць у паэме. Усё гэта правільна, аднак тое, што напісана, заслугоўвае не толькі цёплага слова заахвочвання, але і зусім шчырага адабрэння.

Паспрабуем хоць-бы каротка адзначыць і добрыя і дрэнныя бакі паэмы.

Паэма разбіта на пяць раздзелаў, мае ўступ, кароткую вершаваную біяграфічную даведку, пра якую гаварылася вышэй, і кароткае заключэнне. Самой паэме прадпасланы эпіграфам словы таварыша Сталіна:

«Буржуазія не ведала больш ненавіснага імя, чым імя Дзержынскага, адбіваўшага сталёвай рукой удары ворагаў пролетарскай рэвалюцыі. Гроза буржуазіі—вось чым быў Фелікс Дзержынскі».

Гэта вытрымка, як і добра, з лірычным уздымам і пачуццём напісаны ўступ паэмы, як-бы набліжаюць вобраз вялікага чэкіста да сёнешняга дня, да яго задач. Магутная фігура чалавека ў простым шынелі, які стаіць на плошчы прымежнага гарадка Беларусі і глядзіць на сваіх сыноў-пагранічнікаў, глядзіць і далей — на паднявольны народ там, за кардонам, — уваскрашаюць магутнага і любімага чэкіста, вобраз якога заўсёды жыве ў сэрцы працоўных.

Наступныя тры раздзелы паэмы, прысвечаныя падпольнай рэвалюцыйнай дзейнасці Дзержынскага, паказваюць, як у турмах і ссылках гартаваўся гэты сталёвы чалавек — змагар. За што ён змагаўся? Паэтэса спрабуе адразу адказаць на гэта пытанне і пранесці адказ праз усю паэму. Лірычная песня маці-работніцы над калыскай сына аб той долі, якая чакае яго, і ўступ у паэму паэтычнай мовай гавораць, што Фелікс Эдмундавіч усё сваё жыццё змагаўся за шчасце тых, хто быў прыгнечаны і абяздолены. З імі і на чале іх ён быў усё сваё жыццё, аж да апошняга ўздыху. Вось малюнак Фелікса Эдмундавіча, калі ён праводзіць падпольную сходку (пачатак сходкі пададзен тав. Агняцвет таропка, а таму празаічна і слаба):

Ён падыходзіць стройны да стала.
Глыбокай думаю яснеюць вочы,
І слова кожнае — страла,
І слова кожнае працята болем
За ненакормленых малых дзяцей
І за бедняцкую цяжкую долю,
За слёзы згаслых матчыных вачэй...
...Ён, быццам сцяг, ўздымае голас
гнеўны
На тых, хто век жыве чужым гарбом,
Хто робіць свет магілаю турэмнай,
Хто хоча правіць смерцю і жыццём.



ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ

Нажаль, паэтэса не адчула, што прыведзены вышэй паэтычны ўступ да прамовы Дзержынскага вымагаў такой-жа высокай перадачы самой прамовы. Гэтага няма ў паэме. Паэтэса абмежавалася перадачай заключнай фразы гэтай прамовы і гэта стварыла ўражанне, што ўся прамова зведзена толькі да гэтай заключнай фразы. Гэта адразу знізіла другую палову раздзелу, прадвырашыла яе скомканасць у цэлым.

Чым тлумачыцца такая «аварыя» з добра пачатай і палітычна-напружанай часткай паэмы? На нашу думку, двума прычынамі: недастатковым веданнем матэрыялу і няўважлівым прадумваннем таго матэрыялу, які паэтэса ведала. А ведала яна, што Дзержынскі быў не толькі агністым прамоўцам, але і добрым, глыбокім прапагандыстам, які даскапала ведаў рабочае жыццё і знаходзіў простыя, але глыбокія словы, каб расказаць аб ім рабочым. І такія словы паэтэса павінна была знайсці, каб яркімі фарбамі пачаць партрэт Дзержынскага.

Другі раздзел, прысвечаны турэмнаму перыяду жыцця Дзержынскага, мае рад надзвычай удалых месц.

Спіць турма. Паволі ноч ідзе
Па Варшаўскай чорнай цытадэлі.
І не чутна шолаху нідзе,
А вачэй закрыць не можа Фелікс.
Цішыня, бы сонны, грозны звер...
Раптам дзесьці ўзнікаюць гукі,
Чалавека павялі цяпер —
За спіной яму скруціўшы рукі.
...Дзесь пілуюць. Чуцен гэбляў скрып.
Зноў камусьці шыбеніца будзе.
Закатуюць, мабыць, на зары
І пяском сырым засыпляць грудзі.
Хто сказаў, што вечна будзе так?
Гнеў мільёнаў не задушаць каты.
Стануць поплеч бацька і юнак.
Прыдзе час, суровы час расплаты!

Гэта нязломная вера ў перамогу рэвалюцыі была найбольш яскравай рысай Дзержынскага. Эдзі Агняцвет правільна падкрэслівае яе ў радзе месц сваёй паэмы, у тым ліку і ў сцэне над трупам закатаванага турэмшчыкамі рэвалюцыянера Антона — таварыша і друга Дзержынскага.

Праўда, і ў прыведзеных урыўках ёсць рад слабасцей і шурпатасцей, як, скажам, патрэбныя толькі для рыфмы словы «цяпер», лішняе «мабыць», «скрып гэбляў» замест «шорхата гэбляў» (ды і ці габлявалі дошкі на шыбеніцу?), аднак увесь раздзел напісан з пачуццём, усхвалявана і добра.

Трэці раздзел паэмы — «Мужнасць» —малюнкі сібірскага этапу на фоне рэвалюцыйнай песні калоднікаў. Асабліва вылучаецца момант, калі па просьбе таварышоў Ф. Э. Дзержынскі чытае сваю паэму.

Над галавою снежныя хмары,
Месяц па небе начным не плыве...
...Ён пачынае.
Голас высокі расце і звініць,
Верш устае над лёдавым краем,
Верш заклікае змагацца і жыць.
«Вырас я ў турмах...
у дні маладосці
Многа я гора, пакуты спазнаў,
А каб нанова жыць мне прышлося,
Гэтак-жа зноў-бы жыццё я пачаў».
Альбо некалькі раней:
Спеў закаваны крочыць павол!
І кайданамі пацяху грыміць:
— «Сбейте оковы! Дайте мне волю,
Я научу вас свободу любить».

Пры няўдачы расказа пра Багдану—самому вобразу Багданы, якая ідзе да Дзержынскага праз снягі, гэтым адным радком надаецца жыццё і цеплыня.

Чацверты і пяты раздзелы — паслярэвалюцыйная дзейнасць Фелікса Эдмундавіча:

Вось тут, у пакоі, за шырмай стаіць
Пад коўдрай салдацкаю ложак.
Даўгімі начамі Дзержынскі не спіць,
Ён часам такім спаць не можа.
Варушацца гады па нашай зямлі
І злосна сіпяць на советы.
Паўзуць на заводы, паўзуць на палі
Жывыя нябожчыкі свету.
...Фелікс не ведае цішы.
Рука не падманіць, не дрогне яна,
Калі ён к расстрэлу падпіша.

Я прыводжу гэтыя ўрыўкі, каб паказаць, як Эдзі Агняцвет, удала карыстаючыся дэталямі, паказвае характэрныя рысы Дзержынскага — яго скромнасць, спартанскі вобраз жыцця, яго нязломнасць у барацьбе з ворагамі, бязлітаснасць да іх. У пачатку гэтага раздзелу, таксама карыстаючыся дэталлю — радаснай усмешкай юнака-вартавога каля ўваходу ў дом ВЧК пры адной думцы аб Дзержынскім, — Эдзі Агняцвет падае другую рысу Дзержынскага, яго блізкасць, яго роднасць масам, іх любоў да яго. І трэцяя рыса — даступнасць — мімаходзь вызначаецца ў малюнку, калі да Дзержынскага падбягае беспрытульны.

Далей прыводзіцца цёплы і прачулы малюнак той хвіліны, калі Дзержынскі пасля гутаркі з Леніным паклаў пачатак дзіцячым комунам для беспрытульнікаў. Гэта была велізарнейшая справа, якая вярнула да жыцця, вярнула назад у чалавецтва тысячы і тысячы малечых:

Адзін будзе токар,
другі з іх паэт,
А трэці ляцець будзе ў высі...
...Для гэтага варта было пацярпець,
Пакутваць у царскіх астрогах,
За горла хапаць непакорную смерць,
Хадзіць па таежных дарогах.
Для гэтага варта тварыць, будаваць,
Змагацца нясцынна і смела,
І цемру і гора старое зламаць,
Адным прыгаворам:
«—К расстрэлу!».

Пяты раздзел — «Апошняя прамова»:

Яго любоў чысцей ад ясных рос,
Яна загойвае і раны,
Ягоны гнеў між навальніц узрос,
Крывёю сэрца ўзгадаваны.
Глядзіць ён грозна здраднікам
у твар,
Ён сёння ўсё сказаць ім хоча.
Ім не зламаць наш баявы штандар,
Ім не спыніць работы творчай.
У зале гром ад воплескаў гудзіць,
Дзевяты вал бурліць у зале.

Так спісла, усхвалявана перадае паэтэса ўражанне ад апошняй прамовы вялікага чэкіста. І разам з ёю—ўсхвалявана перажывае гэту хвіліну чытач. Ён бачыць, як у свяшчэнным гневе глядзяць ясныя вочы Дзержынскага ў твар усім здраднікам радзімы, якіх зараз совецкі народ рукамі тав. Ежова пасадзіў на лаўку падсудных, асудзіў і знішчыў, і шлях якіх у той час прадбачыў Ф. Э. Дзержынскі. І тут, як ва ўсёй сваёй рабоце, Дзержынскі адбіваў удары контррэволюцыі, адводзіў іх сваёй сталёвай рукой ад партыі і яе правадыроў. Гэтай барацьбе ён аддаў усе свае сілы, усяго сябе без астатку.

Дай руку, родны ты наш, Фелікс.
—Я сам магу...—усхвалёваным сябрам
Ён прашаптаць ледзь чутна можа.
Ідзе ў пакой суровы свой.
— Я сам... —
І мёртвы падае на ложак.

Прыведзеных урыўкаў з паэмы хопіць, каб паказаць, што Эдзі Агняцвет у асноўным удаўся вобраз таварыша Дзержынскага, што яна здолела паказаць асноўныя рысы гэтага рыцара «без страха и упрека», рыцара рэволюцыі, здолела паказаць яго без штампаў, без «цвёрдакаменнасці» у двукоссі, паказаць яго жывым чалавекам, байцом, камісарам, непахісным змагаром з усім наследдзем капіталістычнага свету — ад адкрытай контррэволюцыі да дзіцячай беспрытульнасці ўключна.

Само сабой зразумела, яшчэ раз падкрэсліваю, што партрэт выканан сіламі маладога, яшчэ растучага мастака, які не завяршыў свайго фарміравання, які яшчэ не ўдасканаліў свайго майстэрства, але знаходзіцца на шляху да гэтага. Таму поруч з трапнымі эпітэтамі, трапнымі метафарамі, сустракаюцца, і ў досыць вялікай колькасці, надакучыўшыя звароты, згубіўшыя сваю дзейснасць выразы, лішнія радкі. Вось прыклады з «Уступу»: «строгая граніца», «жывыя крыніцы», «прыгожыя весны», горад—сведка боек былых, векапомных (не расшыфравана, чаму так назван гарадок), «ён уперад, у даль пазірае», ён глядзіць «на чужыя заводы і сёлы», — усе гэтыя выразы альбо недасканала выказваюць думку, альбо сцёртыя («прыгожыя весны»).

Трэба сказаць, што недастатковая свежасць слоў пры ўмове, калі паэтэса аддае эпітэтам перавагу перад другімі формамі мастацкага слова, з'яўляецца адной з найбольшых небяспек для Эдзі Агняцвет. У значнай меры гэта здараецца таму, што Агняцвет часта звяртаецца да знешняга выгляду свайго героя, да знешняга выгляду пейзажа і недастаткова аддае ўвагі псіхалагічнаму рысунку героя, пачуццям, якія выклікае пейзаж, таму яна можа задаволіцца некалькі абмежаваным і ўстарэўшым лексіконам. Пераход да псіхалагічнага рысунка патрабаваў-бы ўзбагачэння мовы і яе перабудовы.

Навучаючыся ў Маякоўскага «трыбуннаму голасу», Эдзі Агняцвет патрэбна звярнуць асаблівую ўвагу на тое, як Маякоўскі шукаў новага, нясказанага яшчэ слова, новай, свежай, запамінаючайся рыфмы, новага вобраза, як ён дамагаўся максімальнай вобразнасці, сэнсавай нагружанасці радка, унікаючы пустога шматслоўя і квяцістасці. Усяму гэтаму трэба яшчэ вучыцца Эдзі Агняцвет. Мова Эдзі Агняцвет простая, у радзе мест нават некалькі празаічная, і некаторае ўскладненне яе ў паказаным вышэй напрамку — жыццёва неабходна. Таксама патрэбна ўзбагачэнне лексікі і большая шліфоўка верша, а то звычайна верш Агняцвет лепш слухаецца, чым чытаецца. Пры добрай чытцы скрадваюцца немілагучныя спалучэнні складоў у словах і абмежаванасць мовы.

І апошняя заўвага — Э. Агняцвет трэба ў максімальнай меры звязацца з масамі рабочых, калгаснікаў, з іх штодзённым жыццём, каб гэтым павялічваць свой жыццёвы вопыт: эпічныя творы для сваёй удачы патрабуюць вялікага вопыту, дапоўніць які ў маладым веку можна толькі стараннай вучобай, уважлівымі назіраннямі за навакольным жыццём і ўласным актыўным удзелам у штодзённым жыцці народа.

Напісанне паэмы «Фелікс Дзержынскі» паказвае, што Эдзі Агняцвет безумоўна расце як пісьменнік. Гэта трэба вітаць.

М. КЛІМКОВІЧ.



У г. Варашылаўградзе (Данбас) пабудаваны выдатны обеліск у памяць загінуўшых таварышоў пры абароне Луганска (цяпер Варашылаўград). НА ЗДЫМКУ: фрагмент обеліска.

ДЗВЕ ПАЭМЫ ДВУХ РОЗНЫХ КІРУНКАЎ*)

Зусім у іншым плане напісана паэма Эдзі Агняцвет «Фелікс Дзержынскі». Як паказвае сама назва, тэмаю для гэтага твора паслужыла жыццё Фелікса Дзержынскага, гэтага магутнага рыцара пролетарскай рэвалюцыі. Тэма—надзвычай багатая і складаная. Нажаль, Эдзі Агняцвет узяла для паэмы з жыцця Дзержынскага толькі некалькі эпізодаў і якраз пераважна тыя эпізоды (за выключэннем двух апошніх), у якіх Дзержынскі ў сілу турэмных умоў жыцця быў пазбаўлен магчымасці знаходзіцца сярод мас і арганізоўваць іх. Змаганне Дзержынскага за большэвізацыю польскай і літоўскай соцыял-дэмакратыі, змаганне за дыктатуру пролетарыята, за ленінскія прынцыпы інтэрнацыяналізма; яго ўдзел у Вялікай Кастрычніцкай пролетарскай рэволюцыі, у будаванні соцыялістычнага транспарту і прамысловасці; яго шматлікія арышты і высылкі царскім урадам; яго ўцяканні з Сібіры (з якіх два на лодцы па бурных сібірскіх рэках) — увесь гэты багаты шлях рэволюцыянера і каларытны паэтычны матэрыял Эдзі Агняцвет пакінула без увагі.

Змест паэмы складаюць наступныя эпізоды: арышт Дзержынскага на падпольным партыйным сходзе ў 1900 годзе; Дзержынскі ў Варшаўскай цытадэлі і ў Седлецкай турме; шлях Дзержынскага этапам у Сібір; работа ў ЧК (якая, дарэчы сказаць, абмяжоўваецца тым, што Дзержынскі не спіць начамі і марыць стварыць для беспрытульных дзіцячыя комуны) і апошняе выступленне Дзержынскага на пленуме ЦК ВКП(б).

Усе гэтыя эпізоды з шматграннага і цэльнага жыцця вялікага рэволюцыянера кампазіцыйна ў паэме нічым паміж сабою не звязаны і застаюцца нескампанаванымі штрыхамі незакончанага і ледзь-ледзь намечанага партрэта. З другога боку, у паэме няма і таго каларытнага і шырокага гістарычнага фону, на якім патрэбна рысаваць гэты партрэт. Фон вялікага соцыяльнага руху мас, вялікіх класавых баёў і сутычак заменен мізэрным, шэранькім апісаннем хаты, у якой адбываецца сход (у першым эпізодзе) альбо невыразным пейзажам (раздзелы «Мужнасць» і «Чэка»). У выніку партрэт Дзержынскага паўстае перад намі ў паказе Агняцвет не як партрэт рэволюцыянера-арганізатара мас, а як партрэт змагара-адзіночкі. І то ці можна гэта назваць партрэтам, паколькі ў паэме, асабліва ў першых раздзелах, паказаны толькі некаторыя вонкавыя рысы аблічча Дзержынскага, а не яго характар, не яго ўнутраныя якасці рэволюцыянера і філосафа, поўнага агністага энтузіязму, велізарнай энергіі і нязломнай мужнасці.

Між тым, Эдзі Агняцвет мела для сваёй работы выключна багаты фактычны матэрыял — прамовы і выступленні Дзержынскага і, асабліва, яго «Дзённік вязня», гэты выдатны дакумент думак і перажыванняў вялікага змагара. Гэтага матэрыялу яна не здолела выкарыстаць, накіраваўшы ўсю сваю ўвагу на знадворнае, на вонкавае аблічча чалавека, занядбаўшы яго складаны ўнутраны свет, яго залатыя скарбніцы думак і пачуццяў. У выніку як само аблічча героя, так і навакольныя падзеі выйшлі ў паэме апустошаныя, ілюзорныя, а часта і фальшывыя, мастацка непераканальныя.

Трэба аддаць справядлівасць, што першая палова другога раздзелу паэмы Эдзі Агняцвет, не гледзячы на ўсе недахопы, напісана значна лепш, чым рад іншых месц. Гэты ўрывак можна паставіць поруч з такімі лепшымі месцамі ў паэме, як калыханка ў першым раздзеле, як зарысоўка Дзержынскага над трупам Антона і як амаль увесь апошні, пяты раздзел. Але іменна гэтыя месцы тым і вылучаюцца, што тут Агняцвет пакідае паверхню з'яў і спрабуе апусціцца ў іх нутро, у глыбіню чалавечых перажыванняў. Нажаль, такіх месц у паэме не багата, а ў іншых частках яе ўвага Агняцвет ўвесь час прыкавана да вонкавага. Аўтар увесь час тужыцца перадаць усе драбніцы абставін, у якіх адбываюцца падзеі, і кожны самы маленькі рух чалавечай рукі. Але паколькі гэтыя рэчы не адухоўлены высокімі пачуццямі чалавека, яны застаюцца мёртвымі і паказаць іх чытачу навочна Агняцвет не ўдаецца — выходзіць альбо штамп, альбо фальш.

Мы ведаем, напрыклад, што праз усё сваё жыццё, у якіх-бы жахлівых умовах ён ні быў, Фелікс Дзержынскі пранёс як сцяг непахісную веру ў перамогу справы, за якую ён змагаўся, і з якою сілай не адзін і не два разы ён гаворыць пра гэта ў сваім дзённіку: «В тюрьме я созрел в муках одиночества, в муках тоски по миру и по жизни. И, несмотря на это, в душе никогда не зарождалось сомнение в деле». І яшчэ: «Не пропадет даром пролитая кровь ни в чем неповинных людей, голод и страдания народных масс, плач детей и отчаяние матерей!»...

З якою сілаю і з якім вялікім чалавечым смуткам і пераканананасцю гаворыць Дзержынскі. І параўнайце, як абыякава, якімі штампаванымі словамі перакazвае гэта Эдзі Агняцвет:

Хто сказаў, што вечна будзе так?
Гнеў мільёнаў не задушаць каты!
Стануць поплеч бацька і юнак,
Прыдзе час, суровы час расплаты!
Мы разбурым турмаў душны свет,
Разаб'ем праклятыя кайданы!
У сэрцы песня новая расце—
— Быў нічым, а хутка ўсім ты
станеш!

Агняцвет улавіла агульны сэнс выказвання, але не адчула і не перадала глыбокай сутнасці веры Дзержынскага, народжанай пакутамі народа і яго ўласнымі. Яе вабяць не крыштальна чыстыя глыбіні душы, а вонкавыя эфекты. Словы надзвычай гучныя, а думка выйшла бледная. Асабліва гэтая бледнасць залівае тыя старонкі паэмы, у якіх Агняцвет апісвае Дзержынскага на падпольным сходзе. Тут усе героі гавораць аб чымсьці пабочным, неважным і дробязным і гавораць не тымі словамі, якімі павінны гаварыць. Вось першая фраза Дзержынскага:

— Ну, што-ж, сябры, ўжо час ідзе
да ночы,
Нас многа тут. Дык будзем пачынаць.
А вось яго і ўся прамова:
— Таварышы!
Не будзем мы здавацца!
Рабом паноў ніхто не хоча быць.
І заўтра зноў не выйдзем мы на
працу!
Таварышы! Не спынім барацьбы!

На пяць радкоў пяць клічнікаў — і ні аднаго жывога слова, ні адной глыбокай думкі, якімі Фелікс глыбока ўсхвалёўваў масы і вёў іх за сабой. Усе гэтыя размовы на сходзе, як і паводзіны людзей, гучаць фальшыва. Апрача таго, гэтыя непатрэбныя размовы ствараюць уражанне бязмежнай павольнасці. Жыццё Фелікса Дзержынскага было—бура, а ў падачы Агняцвет яно выглядае павольным, аднастайным.

Уражанне павольнасці дапаўняецца яшчэ невыразным рытмам, аднастайнасцю мовы і частымі паўторамі аднаго і таго-ж. Вазьміце хоць-бы ўступ да паэмы альбо, яшчэ лепш, апісанне таго-ж самага падпольнага схода:

Новыя людзі прыходзяць у хату—
Юны наборшчык з усмешкай жывою,
Згорблены муляр, сталяр сіваваты,
Гутараць нешта яны між сабою.
Кожны прыходзіць асобна, употай,
Ціха ступае праз цёмныя сені.
У хаце запахла махоркай і потам,
Скачуць на сценках дзівосныя
цені...

Так павольна і бестурботна збіраліся некалі толькі на вясковыя сходы, але ні ў якім разе не на падпольныя партыйныя сходы.

Аўтар нават не ведае, аб чым людзі могуць гаварыць на сходзе: «гутараць нешта яны між сабою». Яе, зноў-такі, цікавяць не думкі людзей, а вонкавы іх выгляд. Вось гэтая адсутнасць мэтанакіраванасці, паўторы дзеяслова «прыходзяць», людзі, абцяжараныя абстрактнымі эпітэтамі (юнак, з жывою ўсмешкай, сталяр сіваваты), і замаруджваюць тэмп, разбураюць тую ўстрывожанасць і напружанасць, якая тут павінна была-б быць.

Занядбаўшы думкі і пачуцці людзей, Агняцвет няма аб чым пісаць, і яна запаўняе старонкі альбо дробязнымі размовамі, альбо вонкавымі апісаннямі. Зразумелая рэч, што знайсці ў такім разе яркую дэталь альбо трапны эпітэт — немагчыма. І сродкі выражэння ў Эдзі Агняцвет бледныя і невыразныя. Вось некалькі прыкладаў: мужчына «змарнелы і тонкі»; «горды, тонкі твар»; Дзержынскі «танклявы і высокі», «жывыя вочы», «жывая ўсмешка», «жудасны кашаль» і г. д., і г. д.

Відаць, Агняцвет сама адчувае, што яе ўласная ўсхваляванасць не даходзіць да чытача, што яе сродкі выражэння вельмі бледныя, і яна кідаецца ў пагоню за высокім стылем і ўпадае ў меладраматычны тон. Ахарактарызаваўшы, напрыклад, Дзержынскага словамі «суровы і просты, як песня», яна раптам надзяляе яго эпітэтамі «камісар яснавокі», «таполя кіеўскіх вышынь» і інш. Такімі фарбамі пішуць яркія каляровыя лубкі, але ні ў якім разе не строгія мастацкія партрэты.

Няўдалых, штампаваных эпітэтаў у паэме маса. «Змяя» і «звер» скланяюцца ва ўсіх склонах; вецер не толькі «злодзеем» лазіць, але і вые «ваўчыхаю шэрай»; жандары ходзяць «зварунгамі драпежнымі»; «цішыня, бы сонны грозны звер»; «кашаль душыць лютаю змяёй» і г. д.

Мова паэмы «Фелікс Дзержынскі» надзвычай бедная і неахайная. Слова «раптам» паўтараецца разоў дзесяць.

Аднак, не гэтыя прыкрыя тэхнічныя недахопы становяць галоўную прычыну няўдачы паэмы. Прычына гэтага крыецца глыбей. Яна, па-першае, ужо ў тым, што Агняцвет узяла для паэмы толькі асобныя эпізоды з жыцця Фелікса Дзержынскага і ўжо дзеля гэтага аднаго не можа нарысаваць поўнасцю партрэта Дзержынскага. Але калі-б увага паэта не пайшла па лініі вонкавых эфектаў, а была-б накіравана на ўнутраны глыбокі змест жыцця вялікага рэволюцыянера, — мы і ў дадзеным выпадку мелі-б хоць і асобныя, але яркія малюнкі. Нажаль, Агняцвет занядбала асноўны прынцып мастацтва — пісаць пра жывых людзей, г. зн. пра іх пачуцці і думкі, якія кіруюць іх паводзінамі. І пафас, у якім Агняцвет імкнулася напісаць свой твор, накіраван на дробязі і таму вельмі часта гучыць фальшыва.

У выніку ўсяго гэтага паэма, калі і з'яўляецца цікавым эпізодам у творчасці самой Агняцвет (у сэнсе авалодання эпічным жанрам), дык у нашай паэзіі наогул новага гэтым творам нічога не сказана, не зважаючы на веліч і актуальнасць самой тэмы і на асобныя, не благія кавалкі паэмы.

ПЯТРО ГЛЕБКА.

*) Канец. Пачатак гл. у № 12 ад 3 сакавіка.

Ад рэдакцыі

Друкуючы артыкулы П. Глебкі і М. Клімковіча, якія даюць супрацьлеглую ацэнку паэмы Эдзі Агняцвет «Фелікс Дзержынскі», рэдакцыя адзначае неабгрунтаванае імкненне М. Клімковіча за агульнай пахвалой паэмы не заўважаць яе істотных недахопаў.

А недахопы гэтыя заключаюцца напершае, у тым, што ў паэме слаба паказана сувязь Дзержынскага з масамі, па-другое, у некалькі павярхоўным паказе якасцей, уласцівых Дзержынскаму. Гэтым, уласна кажучы, тлумачыцца, што поўнацэнны вобраз большэвіка-чэкіста, жалезнага Фелікса паэтэсе не ўдаўся, аб чым зусім справядліва гаворыць у сваім артыкуле П. Глебка.

Але, упадаючы ў крайнасць, П. Глебка схільны адмаўляць якое-небудзь значэнне паэмы для беларускай літаратуры. І ў гэтым асноўная памылка яго артыкула.

Рэдакцыя лічыць, што паэма маладой паэтэсы Агняцвет заслугоўвае ўвагі перш за ўсё таму, што паэма ўпершыню ў беларускай літаратуры ставіць задачу паказаць у мастацкім творы вобраз рыцара пролетарскай рэволюцыі Фелікса Дзержынскага. Паэма мае рад яркіх эпізодаў з жыцця і дзейнасці Дзержынскага, дае некаторыя характэрныя рысы яго вобраза. І той факт, што маладая паэтэса ўзяла аб'ектам сваёй творчасці такую складаную і патрэбную тэму, — заслугоўвае заахвочвання.

Рэдакцыя цалкам салідарна з думкай паэтычнай секцыі, якая абмяркоўвала паэму і палічыла, што паэма надрукавана заўчасна і патрабуе далейшай дапрацоўкі.

КЛАСІК СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПАЭЗІІ

Паэтычная спадчына Маякоўскага з'яўляецца адным з найвялікшых дасягненняў совецкай літаратуры. Навекі ўвойдуць у жалезны фонд соцыялістычнага мастацтва неўміручыя творы таго, каго правадыр сусветнага пролетарыята таварыш Сталін назваў «лепшым, таленавіцейшым паэтам нашай совецкай эпохі».

Гісторыя рускай і сусветнай літаратуры ведае рад прыкладаў таго, як лепшыя паэты мінулага ставілі, падобна Маякоўскаму, сваю творчасць на службу народу, выступаючы ў якасці агітатараў-трыбунаў, глашатаяў палітычнай барацьбы. Цудоўныя ўзоры такой актуальнай, рэволюцыйна-насычанай паэзіі, якая карысталася велізарнай папулярнасцю, далі Беранжэ ў Францыі, Гейне і Фрэйліграт у Германіі і г. д.

У нашай краіне да ўзораў палітычнай, інакш называемай «грамадзянскай» паэзіі, якая адыграла выключную ролю ў развіцці народнай самасвядомасці, адносяцца выдатныя па сваёй пераканаўчасці і сіле ўздзейнічання на масы вершы Рылеева, Пушкіна, Палежаева, творы дэмакратаў—Некрасава, Курачкіна, Міхайлава і іншых. Высокі грамадскі пафас, палітычная трапнасць, вастрыня, едкая бічуючая сатыра, палкая ненавісць да носьбітаў соцыяльнага зла—ператваралі гэтыя творы ў выдатную зброю барацьбы за вызваленне прыгнечаных.

Лепшыя традыцыі гэтых выдатных паэтаў, песняроў соцыяльнага пратэсту, барацьбітоў за разняволенне народа знайшлі свайго вартага прадаўжальніка ў асобе Маякоўскага. Іменна яму ўдалося з найбольшым майстэрствам і глыбінёй адлюстраваць ў сваёй паэзіі нашу рэволюцыйную рэчаіснасць, знайсці яе адэкватнае і поўнацэннае выражэнне ў яркіх мастацкіх вобразах.

Маякоўскі пачаў свой творчы шлях напярэдадні імперыялістычнай вайны, як паэт-футурыст, носьбіт напоўанархічнага бунтарства супроць існуючага ладу. Тым не менш, ужо ў яго ранніх дарэволюцыйных творах ярка праяўляецца дараванне вялікага мастака—выкрывальніка, шчырага, страснага паборніка грамадскай справядлівасці.

Так, на разгар ура-патрыятычнага чаду і звярынага шавінізма, што штучна распаляўся пануючай клікай у Расіі ў часе імперыялістычнай вайны, Маякоўскі рэагіруе сваім вядомым вершам «Вайна абвешчана». Якім глыбокім прадбачаннем і грамадзянскай мужнасцю трэба было валодаць паэту, каб яшчэ пры абвяшчэнні вайны ў 1914 годзе заклеймiць яе, як бессэнсоўную братазабойчую бойню, абяцаючую незлічоныя афяры і пакуты народу.

З вялікай страсцю і нянавісцю паэт ополчаецца супроць тых, за чые драпежніцкія інтарэсы змагаліся салдаты ў часе імперыялістычнай вайны, выкрывае яе класавы характар (верш «Вам») Адначасова ён смуткуе аб «израненных страдальцах», прыведзеных на ўбой ва ўгоду шавіністычнай буржуазіі.

Аднак, Маякоўскі—не супроць усякай вайны. Ен не мае нічога агульнага з абывацельскай трусасцю і бесхрыбетным пацыфізмам, які пры любых акалічнасцях імкнецца пазбегнуць узрушэнняў, у тым ліку непазбежнага соцыяльнага перавароту і грамадзянскай вайны.

Ужо з першых дзён рэволюцыі Маякоўскі становіцца ў рады яе актыўных удзельнікаў. Неразрыўная сувязь з пролетарыятам, песняром якога да апошніх дзён свайго жыцця быў паэт, у спалучэнні з велізарным мастацкім талентам, дазволіла Маякоўскаму дасягнуць сапраўдных вышынь рэволюцыйнай лірыкі, стварыць неперавзыйдзеныя ўзоры соцыялістычнага рэалізма ў паэзіі.

З прыходам да ўлады пролетарыята закономерна змяняюцца адносіны паэта да вайны. Вершы Маякоўскага заклікаюць да бязлітаснага разгрому інтэрвентаў, знадворных і ўнутраных ворагаў Совецкай краіны, узнімаюць дух байцоў, з'яўляючыся першакласным па свайму ідэйнаму ўздзейнічанню агітацыйна-мастацкім матэрыялам («Левы марш», «Казка аб дэзертыру», «Бабскія бублікі», «Апошняя старонка грамадзянскай вайны» і г. д.).

Тэма патрыятызма, барацьбы з ваеннай небяспекай, тэма мабілізацыйнай гатоўнасці да сакрушальнага адпору інтэрвентам—ворагам совецкай радзімы павінна быць, прызнана, на наш погляд, дамініруючай у літаратурнай спадчыне вялікага паэта. Такія вершы як «Рыхтуйся», «Так ці не», «Польшча», «Вегетарыянцы», «Дзесяцігодняя песня», «Марш абароны», «Далоў» і іншыя, датыраваныя яшчэ 1927—28 гг., заклікаюць нас трымаць порах сухім, пільна сачыць за падкопамі ворагаў, няспынна мацаваць абарону.

Дзесяць год прайшло з часу стварэння гэтых твораў, а наколькі яны актуальныя, злобадзённыя і каштоўныя для нашых дзён!

У сваім адказе комсамольцу Іванову таварыш Сталін падкрэслівае, што «было-б смешна і глупа закрываць вочы на факт капіталістычнага абкружэння і думаць, што нашы знадворныя ворагі, напрыклад, фашысты не паспрабуюць пры выпадку зрабіць на СССР ваенны напад». («Пісьмо таварыша Іванова і адказ таварыша Сталіна», выд. «Молодая гвардия», 1938, стар. 11). І далей: «Трэба ўвесь народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знадворных ворагаў не маглі застаць нас знянацку». (Там-жа, стар. 14).

Якой выдатнай ілюстрацыяй да гэтага палажэння таварыша Сталіна гучыць перасцярога Маякоўскага:

И Врангель и Колчак
усопли мирно оба.
Схоронят и других...
не бог, так время даст.
Но не усопла —
удесятерилась злоба
Советы окруживших
буржуазных государств...

Паэт заклікае рабочых і сялян дзень і ноч рыхтавацца да абароны, —

чтоб мог ежеминутно
наш Союз,
на гром оружия
и на угрозу речью, —
на массу опираясь,
крикнуть:
«Не боюсь!
Врага,
не дрогнувши,
вооруженный встречу!»

Паэт не забывае і аб тым, што пакуль нас абкружаюць імперыялістычныя краіны, яны нястомна будуць засылаць у наш тыл шпіёнаў, дыверсантаў, бандытаў, забойцаў, з якімі неабходна самая бязлітасная расправа. Ен заклікае нас да пільнасці, згуртавання сіл, умення распазнаваць і своечасова абязшкоджваць кожнага ворага («Прызыў», «Твар класавага ворага» і інш.).

З гэтай тэмай аб пільнасці і абароне краіны ад ваеннай пагрозы арганічна звязана ў Маякоўскага тэма сусветнай рэволюцыі, у блізкасці і непазбежнасці якой упэўнен аўтар («150.000.000», «Патрасаючыя факты»), і інтэрнацыянальнай салідарнасці працоўных усіх краін («Лепшы верш», «Англійскаму рабочаму», «Неперамажная зброя», «На Захадзе ўсё спакойна»). Аўтар не сумняваецца ў тым, што ў момант рашаючай схваткі ўзброенай Совецкай краіны з капіталістычным светам міжнародны пролетарыят акажа нам самую актыўную падтрымку.

Непрымірымы праціўнік бюракратызма, разгільдзяйства, пошласці, безкультур'я, бытавога разлажэння, абывацельшчыны і шкурніцтва, — Маякоўскі наносіць трапныя ўдары гэтым перажыткам капіталістычнага мінулага ў нашай краіне, мабілізуе масы на іх хутчэйшае выкараненне ў эканоміцы і свядомасці людзей («Празасядаўшыяся», «Аб дрэні», «Адказ на мару», «Пісьмо да каханай Малчанава» і г. д.).

Сіла ўздзейнічання творчасці Маякоўскага заключаецца перш за ўсё ў арганічнай спаянасці яго з рабочым класам, на службу якому паэт мабілізуе свой велізарны талент страснага, тэмпераментнага байца, актыўнага будаўніка соцыялізма. Адсюль — такая цудоўная ўласцівасць яго вершаў, як **большэвіцкая ідэйнасць**, завостранасць, уменне належны лозунг партыі і ўрада давесці да свядомасці мас у даходчывай, арыгінальнай, адпаведнай зместу форме.

У свой час дылетанты і аматары «изящных» вершаў сцвярджалі аб «манернасці і вычварнасці» ўсіх вершаў Маякоўскага, быццам-бы недаступных масаваму чытачу, дысгарманіруючых з «сапраўднай» паэзіяй. Яшчэ больш рэзка апалчаліся на паэта зараз выкрытыя ворагі народа, дыверсанты ад літаратуры з трацкісцка-бухарынскага лагеру наймітаў фашызма, якія ўсяляк імкнуліся дыскрэдытаваць Маякоўскага, ахаяць гэту цудоўную спадчыну, «все сто томов его партийных книжек».

Гэта дыверсія на літаратурным фронце была своечасова выкрыта совецкай грамадскасцю. Ганебна правалілася гнусная спроба заклятага ворага народа Бухарына абвясціць «аджыўшымі агіткамі» першакласныя вершы найвялікшага совецкага паэта.

Совецкі чытач надзвычай любіць і цэніць свайго Маякоўскага, штодзённа выкарыстоўвае яго багацейшую творчасць, якая ўладае велізарнай ідэйнай сілай і выключным майстэрствам паэтычнай формы. На вершах Маякоўскага выхоўваецца наша падрастаючае пакаленне, якое вывучае ў школе лепшыя ўзоры яго творчасці.

Гэта па сутнасці аб сабе, аб тым, якой павінна быць совецкая літаратура, аб сіле комуністычнай тэорыі пісаў Маякоўскі ў вершы «Арсенал ленінцаў»:

Наши танки
стопчут
и стены и лужи.
Под нашим наганом,
белый,
жмись.
Но самое сильное
наше
оружие—
большевистская мысль.

Своеасаблівасць пабудовы верша, рытму, лексікі і ўсяго паэтычнага стылю Маякоўскага ў цэлым цалкам абумоўлена грандыёзнасцю зместу яго паэзіі, падобнага якому не ведала папярэдняя класічная літаратура.

Шматстайна і шырока тэматыка Маякоўскага, які ўмеў, як ніхто, з выключнай праматой, чуласцю, талентам і аператыўнасцю адгукацца амаль на ўсякую сапраўды **актуальную** тэму сучаснасці, прымусіць яе поўнавесна гучаць у свядомасці мільённых мас чытачоў. Асвойваючы гэтыя якасці, навучаючыся ў Маякоўскага і яго папярэднікаў-класікаў паэтычнаму майстэрству,—совецкая літаратура дасягне новых, буйнейшых перамог у справе развіцця і ўдасканалення паэтычнага мастацтва.

І. ЗЕЛЬЦЭР.



В. В. Маякоўскі. З фатаграфіі 1928 г.

ВЕРШЫ

Мікола Сямашка

ВЯСНА

Марозная свежасць ружовай зары,
Цячэнне халоднае буйнай вады,
Гракоў прывітальны і радасны крык,
На росных палях надвячоркавы дым;

Адменныя пахі адталай зямлі,
Узрушаны гоман смалістых лясоў,
Набухшыя, важкія почкі галін,
Пахучы, халодны бярозавы сок;

Гамонка шчаслівых дзяцей каля хат
І ўвечар, за дальнім узгоркам крутым,
Вясёлай і дружнай брыгады дзяўчат
Высокае, цёплае песні матыў;

І веснікі звонкага свежага дня—
Вятры, што ад цёплых марэй прыплылі,
І трактара першая баразна,
І ўсё ночы [illegible]
Вясна.

Грудзьмі-б прытуліцца да маці-зямлі.
З пяшчотнасцю шчырай слухмяных
дзяцей!
Падслухаць-бы сілы магутны прыліў,
Адчуць, як яна, маладая, цвіце.

Узяць-бы у роднай яе пераняць
І музыку рэк, і напевы вятроў,
У яе навучыцца-бы песні складаць
З жывых, як паводкі імклівыя, слоў,

Каб дзеўчына гэтую песню ўзняла
Да самых глыбокіх і ясных вышынь,
Каб гэтая песня да сонца дайшла
Адбіткам жывым чалавечай душы.

ДЗЯВОЧАЯ

За ракою — луг някошаны,
І прасторы спелых ніў.
За ракою той — харошы мой,
Весялун і гарманіст.

Чую днём спакойны ляскат я:
Водзіць трактар за ракой
Самы лепшы, самы ласкавы,
Яснавокі сокал мой.

А як зоры тыя спелыя
Згубіць вечар малады, —
Кліча любы песняй смелаю
Пад гармоніка лады.

Як дайсці?
На мост—не хочацца
Гэткі круг дарма даваць,
За раку-ж так сэрца просіцца..
Нацянькі—рукой падаць

Ну, няхай!
Не так шырокая
Рэчка з бегам ціхіх вод, —
Адшукаю неглыбокае,
Перайду яе у брод.

Б. Сасноўскі

ЗАМОЖНАСЦЬ

Мы шчасліва жывем і спяваем,
Скарб нам светлы прыносіць зямля.
Песня славы ляціць па-над краем
Аж да самых да вежаў Крэмля.

Дні былі. Без канца, без граніцы
Разліваўся ўраджай залаты,
Хвалявалася морам пшаніца,
Нібы лес, уставалі жыты.

Працавалі мы ўсёй гаспадаркай.
Кожны дзень ад зары да зары.
Стракаталі ў прасторах жняяркі,
Неэмаўкалі-гулі трактары.

Хлеб у гумны пазвозілі самі.
Дружнай праца была на жніве.
Сёння з самага ранку вазамі
Зерне ў нашыя клеці плыве.

Усміхаецца горда дзядуля,
Ідучы да суседа ў сяло:
— Ці гадалі калі, а ці чулі,
Колькі ў хату багацця прышло.

Жыў раней, як гавораць, пагана,
Увесь век свой гарбеў і сівеў.
Працаваў на падпанка, на пана—
Нават хлеба скарынкі не меў.

Старшыня з брыгадзірам тым часам
Сустракаюць, вітаюць яго:
— Дзед, падзяку прымі ад калгаса
За дачку і за сына свайго...

Сын з дачкой—трактарысты ў калгасе,—
Трактарам іх работы было!..
Пра іх песня высока ўзнялася,
Не адно абляцела сяло!

Вечарэе. Агні ўжо зазззялі.
Шум і гоман стаіць на сяле..
Жыць цяпер па-заможнаму сталі,
Жыць мы сталі цяпер весялей.

Выданне твораў В. В. Маякоўскага

План Белдзяржвыдавецтва па выданню твораў В. В. Маякоўскага вельмі скромны. Нават на выданне аднатомніка Белдзяржвыдавецтва не ў стане сабраць неабходныя сілы, хоць яны ёсць у нас багата.

У 1937 годзе вышлі з друку толькі дзве кніжкі Маякоўскага: паэма «Уладзімір Ільіч Ленін» на беларускай мове ў перакладзе П. Броўкі і невялічкі зборнік вершаў на рускай мове.

Калі да гэтага дадаць «Абаронныя вершы» Маякоўскага, якія вышлі з друку да ХХ гадавіны Чырвонай Арміі на рускай мове, то спіс выданых твораў Маякоўскага будзе поўным.

Тры кніжкі Маякоўскага знаходзяцца ў друку. Першая — зборнік «Выбраныя творы» на беларускай мове. Сюды ўвайшлі чатыры вершы — «Левы марш», «Блэк энд уайт», «Юбілейная» і «Празасядаўшыяся» у перакладзе Рыгора Лынькова і паэма «Уладзімір Ільіч Ленін» у перакладзе П. Броўкі. Другая кніжка—«Маякоўскі — дзецям» на беларускай мове ў перакладзе Якімовіча. Трэцяя—тое-ж выданне для дзяцей на яўрэйскай мове ў перакладзе Шведзіка.

Рыхтуецца да друку зборнік выбраных вершаў Маякоўскага на яўрэйскай мове. У зборнік уваходзяць: урывак з паэмы «На ўвесь голас», урывак з паэмы «Хораша», вершы «Левы марш», «Комсамольская», «Таварышу Нэтэ, параходу і чалавеку», «Парыжскім комунарам».

Вось увесь «план» выдання В. В. Маякоўскага на 1938 год!

„МАЧЫХА“ О. БАЛЬЗАКА

(Пастаноўка Дзяржаўнага рускага тэатра БССР)

Вялікі французскі пісьменнік Онорэ дэ Бальзак у сваёй шматтомнай «Чалавечай камедыі» даў сапраўдную мастацкую гісторыю сваёй эпохі — эпохі часова перамогшага пасля паражэння Напалеона Банапарта, але ўжо асуджанага на гібель і разлагаемага бурным ростам фінансавай буржуазіі класа арыстакратычнага дваранства. Сам прыхільнік родавой арыстакратыі, О. Бальзак тым не менш цалкам стаіць на баку новага класа і фарміруемага ім новага грамадства.

На працягу свайго жыцця О. Бальзак напісаў рад меладрам і трагедый, камедый і драм, адны з якіх мелі большы, другія меншы поспех у публікі, але ні адна з якіх не прынесла сапраўднага поспеху пісьменніку пры яго жыцці. Гэты поспех прынесла яму драма «Мачыха», напісаная ў 1848 годзе, за два гады да смерці пісьменніка.

«Мачыха» — буржуазная сямейная драма, створаная О. Бальзакам у тым-жа плане, што і цыкл раманаў, аб'яднаных агульнай назвай «Чалавечая камедыя». Гэта па форме—бытавая драма салона, але разам з тым і па сутнасці — соцыяльная драма распаду арыстакратычнай сям'і, якая толькі сюжэтна канчаецца асабістай трагедыяй — смерцю двух яе герояў. Напісаная ў стылі суровага рэалізма, гэта п'еса О. Бальзака прынесла пісьменніку такую-ж вядомасць у галіне драматургіі, як яго «Шагрэневая скура» у галіне рамана.

Асноўнымі персанажамі п'есы з'яўляюцца: генерал граф дэ Граншан, Паліна — дачка генерала, Гертруда — жонка генерала і мачыха Паліны і Фердынанд Маркандаль — упраўляючы сукнавальнай фабрыкай дэ Граншана. Астатнія асобы — доктар Вернон, друг дома, сведка паходаў і асабісты прыяцель генерала, Гадар — сын землеўласніка, які мае 400 тысяч даходу і за грошы купіў сабе высокі арыстакратычны тытул, прэтэндэнт на руку Паліны, Еўгеній Рамель — каралеўскі пракурор, судовы следчы і іншыя — толькі звенні ў ланцугу драматычных падзей, што разгортваюцца вакол асноўных персанажаў.

Паводзінамі дзеючых асоб рухаюць не столькі страсці, колькі грошы. Сямейная драма перарастае ў драму соцыяльную. О. Бальзак паказвае ў ёй тое-ж, што і ў іншых сваіх творах, — карціну таго, як «усё ўзрастаючы націск падымаючайся буржуазіі на дваранскае грамадства» разбурае «апошнія рэшткі гэтага ўзорнага для яго грамадства» і як гэтыя рэшткі альбо «паступова загінулі пад націскам вульгарнага грашовага выскачкі альбо былі разбэшчаны ім; як гранд-дама, супружаскія здрадніцтвы якой былі толькі спосабам адстаяць сябе, цалкам адпавядаўшым таму становішчу, якое ёй было адведзена ў шлюбе, саступіла месца буржуазнай жанчыне, якая набывае мужа для грошай альбо ўбранняў...» (Ф. Энгельс). Дзейнічае тое, што прышло на змену гістарычна аджыўшаму сябе феадалізму, — капіталізм; дзейнічаюць грошы.

Іменна гэта трэба памятаць, калі глядзіш на сцэне п'есу О. Бальзака «Мачыха». Тады паводзіны Гертруды, Фердынанда, Паліны, Гадара выступяць апраўданымі ўдвая, а смерць двух з іх у канцы спектакля толькі з большай сілай падкрэсліць, што барацьба паміж героямі разыграўшайся і разыгранай акторамі драмы — не любоўныя інтрыгі суперніц і супернікаў мяшчанскай меладрамы, а барацьба сіл у класавым чалавечым грамадстве,— барацьба, якая не ведае літасці.

Такім чынам, перад гледачом—драма. Генерал дэ Граншан, сам таго не ведаючы, трапляе ў «раганосцы». За яго спіной адбываюцца жорсткія сутычкі паміж Палінай і Гертрудай: і падчарка і мачыха аднолькава, па законах сэрца, прэтэндуюць на Фердынанда. Адна з іх, Паліна, гордая сваім святым і чыстым каханнем, вольная ў выбары, другая — Гертруда звязана святасцю шлюбнага абавязацельства, страх выкрыцця парушэння якога—яе пакута і адначасова слабае месца ў яе барацьбе з Палінай.

Генерал дэ Граншан лічыць сваёй арыстакратычнай чэсцю нянавісць да тых, хто некалі здрадзіў яго куміру—Напалеону I. Нават свайго сына Леона ён называе Напалеон. Ен фанатычна заяўляе, што ўласнымі рукамі знішчыць кожнага нават далёкага патомка здрадзіўшых Напалеону генералаў, абы толькі прадставіўся выпадак. Даючы поўную свабоду выбару Паліне, ён тым не менш няўмольна абураны, калі Паліна «выпрабоўвае» яго сапраўдныя адносіны да яе словамі: што рабіць ёй у тым выпадку, калі-б яна пакахала аднаго з прадстаўнікоў яго палітычных праціўнікаў. «—Не гаварыць мне аб гэтым, пакуль я жыву» — заяўляе бацька. Але і пасля яго смерці яна не павінна рабіць гэтага, бо ён «з труны гатоў устаць, каб праклясці яе» у такім выпадку.

Фанатызм дэ Граншана прыводзіць да развязкі салонную драму. Фердынанд — сын генерала Маркандаля, здрадзіўшага Напалеону. Ен старанна хавае гэта ад усіх, тым больш ад генерала. Але гэта вядома абедзвюм жанчынам. Калі яны не скарысталі гэтага ў сваёй барацьбе, паколькі абедзве былі зацікаўлены ў захаванні тайны Фердынанда, дык цяпер, калі на карту ўжо ставіцца ўсё, калі пачуцці раўнасці саступаюць месца пачуццям помсты. Гертруда пагражае выкрыць сапраўднае імя Фердынанда перад генералам.

Паліна раздаўлена. Яна настолькі кахае Фердынанда, што страта яго роўнасільна смерці. Затраўленая мачыхай, яна прымае выкрадзеную ў яе атруту...

Фінал Рамео і Джульеты. Старая трагедыя на новай аснове. Змяшалася ўсё: родавая чэсць — і грошы, рыцарскае каханне — і буржуазны крымінальны раман, ігра страсцей і ігра рэчаў. Жудасны малюнак распаду арыстакратычнай сям'і, ломкі вякамі ўстаноўленых нораваў, маральных норм.

Вось асноўныя контуры п'есы «Мачыха» у інтэрпрэтацыі Рускага драматычнага тэатра БССР. Пастаўленая мастацкім кіраўніком тэатра А. Дыкінацці, яна даносіць да гледача ўсе рысы суровага бальзакаўскага рэалізма. Добра, у адпавядаючым п'есе стылі аформлен спектакль (мастак М. Лорыс).

Пастаноўшчык выкінуў з п'есы ўсё лішняе, абцяжарваючае ў тэксце перакладу Затое ўсё, што пакінута некранутым, абыграна старанна і з добрым мастацкім густам. Да гледача даходзіць кожнае слова.

Ролю Гертруды выконвае арт. Н. Д. Барысевіч. Надзвычай удала паказана ёю сільная, страсная і разам з тым жудасна халодная, з дэспатычным, разліковым характарам жанчына, здольная стварыць ілюзію дабрачыннасці і прыстойнага сямейнага жыцця, ілюзію пяшчотнай маці і разам з тым гатовая на любую подласць у дасягненні сваёй карыслівай мэты, гатовая закатаваць сваю «любую падчарку». «Жанчыны забіваюць адна другую песцячыся» — гаворыць пра яе Вернон, і гэтыя словы — тыя словы, якія просяцца на вусны гледачу, калі ён сочыць за паводзінамі Гертруды.

Ролю Паліны выконвае арт. А. Б. Обуховіч. Ей у п'есе адведзена роля афяры. І перад гледачом у спектаклі яна не выходзіць за гэтыя рамкі. Прыгожая, маладая дзяўчына, багатая нявеста — вось і ўсё пра яе. Расцвітае на сцэне і заваёўвае сімпатыі гледача Паліна сваім чыстым і благародным каханнем. Але і яе мачыха навучае хлусіць. Сільная сваім каханнем, яна ўсё-ж настолькі молада і нявопытна, што не вытрымлівае інтрыгі мачыхі і гіне, раздаўленая гэтай інтрыгай. А. Обуховіч добра вядзе сваю ролю, хоць і не стварае, паводле матэрыялу, такога цэльнага вобраза, як Барысевіч.

Генерал дэ Граншан у выкананні арт. А. Рэйхель — цэльная фігура, запамінаючыйся вобраз. Праўда, не зусім удала, з налётам фальшывага псіхалагізма іграе А. Рэйхель у апошнім акце (сцэна ля ложка Паліны і сцэна паяўлення Паліны перад смерцю ў гасцінай). Апошняя сцэна ў гасцінай гучыць крыху містычна і генерал у ёй часова страчвае аблічча любячага бацькі: пры паяўленні Паліны ён нават не кратаецца з месца. Стан асулупянення не даходзіць да гледача.

Вобраз Фердынанда Маркандаля ствараюць два актары — А. П. Белаліпецкі і Г. Е. Морэн. Абодва заслугоўваюць дадатнай ацэнкі, але кожны з іх мае і свае мінусы. Моцная, амаль дэманічная фігура любоўніка атрымліваецца ў спектаклі ў А. Белаліпецкага. Але ў гэтым-жа і слабасць вобраза: па п'есе Фердынанд — паэт, страсны паэт па натуры, які, па сведчанню яго друга Рамеля, у паэзію ператварыў ўсё сваё жыццё. Правільны ў асноўным вобраз Фердынанда, створаны Белаліпецкім, эмацыянальна ўсё-ж не адпавядае замыслу О. Бальзака. Арт. Г. Морэн у створаным ім вобразе больш адпавядае аўтарскаму замыслу, ён больш лірычны, больш пачуццёвы, але яго ігра больш вонкавая і не стварае такога ўражання па сіле страсці, як ігра Белаліпецкага.

Ролю Гадара таксама выконваюць два акторы — С. В. Палякоў і Н. В. Раманаў. Сур'ёзна можна гаварыць толькі аб ігры С. Палякова. Створаны ім вобраз хітрага, кар'ернага і разам з тым даволі нахабнага жаніха—больш дзялка, чым любоўніка — цалкам адпавядае вобразу, створанаму О. Бальзакам. Акт. Н. Раманаў толькі слаба пераймае ігру С. Палякова і яго вобраз самастойнага значэння не мае.

З астатніх вобразаў спектакля надзвычай удалым трэба прызнаць доктара Вернона ў выкананні арт. В. Я. Капаплянскага. Сярод эпізадычных ролей цікавы вобраз судовага следчага ў выкананні арт. І. К. Фаюткіна, вобраз падмайстра Шампань (акт. Н. Д. Смірноў). Нядрэнны каралеўскі пракурор Рамель (акт. Е. Л. Рамаnoўскі); толькі занадта сухаваты. Сын дэ Граншана—Напалеон у выкананні арт. А. Б. Рышчакай быў-бы нядрэнны, калі-б не выдаваў жаночую фігуру. На нашу думку, грым гэтаму вобразу падабраны няўдала.

Астатнія тры маленькія ролі — аптэкар Бадрыльён (акт. А. Н. Якаўлеў), лакей Фелікс (акт. В. М. Казачок) і нянька Маргарыта (акт. Е. І. Стрэлкова) — нічым асаблівым не вызначаюцца, выконваюцца акторамі культурна.

Да недахопаў спектакля трэба аднесці, на нашу думку, адну акалічнасць. П'еса празмеру скарочана. Скарачэнні пайшлі, галоўным чынам, на карысць спектакля, але яны разам з тым закранулі і соцыяльную трактоўку п'есы: некаторых купюр у Гертруды і Гадара, асабліва ў Гертруды, не трэба было рабіць. Пастаноўшчык вядзе спектакль у плане салоннай драмы — і якраз так, што соцыяльная падаплека падзей крыху стушоўваецца. П'еса-ж О. Бальзака дае больш матэрыял для трактоўкі яе як драмы соцыяльнай.

Увогуле мы адзначаем добры спектакль і віншуем калектыў тэатра з чарговым поспехам у асваенні класікі сусветнай драматургіі.

Р. ЛЫНЬКОЎ.

Няма клопатаў аб маладых акторах

Самае вялікае шкодніцтва, самы адчувальны ўдар, які быў нанесены ворагамі народа тэатральнаму фронту ў БССР, заключаецца ў зрыве справы выхавання тэатральных кадраў, у поўнай ліквідацыі арганізаваных раней школ і студый, якія павінны былі выхоўваць актораў.

Толькі дзе-ні-дзе ў тэатрах БССР удалося захаваць напоўсаматужныя студыі, якія, не гледзячы на поўную пагарду да іх з боку Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР, прадаўжалі сваё існаванне.

Такую студыю ўдалося захаваць пры Дзяржаўным беларускім драматычным тэатры. Студыя, пазбаўленая сродкаў, трымаючыся, можна сказаць, выключным энтузіязмам работнікаў тэатра і саміх студыйцаў, дала нядрэнныя вынікі. Спектакль «Слуга двух паноў», пастаўлены гэтай студыяй, быў цёпла прыняты гледачом і безумоўна заслугоўвае дадатнай ацэнкі.

Не большую ўвагу, чым на студыю Белдзярждрамтэатра, звярталі былыя кіраўнікі Упраўлення па справах мастацтваў і на Ленінградскую беларускую тэатральную студыю.

Калі-ж прыглядзецца да практыкі некаторых тэатраў, дык стане відавочным, што яны ў адносінах да тэатральных кадраў следавалі прыкладу сваіх кіраўнікоў.

Становішча маладых актораў ў Віцебскім дзяржаўным беларускім тэатры можна лічыць надзвычай характэрным ў гэтых адносінах.

Тэатр налічвае каля двух дзесяткаў маладых актораў. Адны з іх былі ў іншых тэатрах, іншыя дзе-ні-дзе выпадкова вучыліся, але бадай усе сістэматычнай тэатральнай адукацыі не атрымалі. Большасць гэтай моладзі, па агульнаму прызнанню актораў тэатра, людзі здольныя. Фадзееў, Маўзон, Кагаін, Заранок, Краўчанка, Казлоў, Гарэлава, Вічфінскі, Канапелька, Майсак, Маркоўская і многія іншыя маладыя акторы змаглі — адны ў эпізадычных, іншыя ў больш сталых ролях — паказаць свае здольнасці.

Але справа ў тым, што гэтыя эпізадычныя альбо больш сталыя ролі для усіх гэтых і для многіх іншых актораў з'яўляюцца своеасаблівым шчасцем, якое спатыкае іх адзін раз у год, а то і радзей.

У чым-жа справа? Няўжо ў тэатры такі вялікі творчы калектыў, што не хапае ролей? Гэтага сказаць нельга. Наадварот, 3—4 лепшыя акторы тэатра загружаны да немажлівасці. Можа, гэтыя лепшыя акторы і з'яўляюцца перашкодай для вылучэння моладзі? Наадварот. Яны пастаянна скардзяцца на вялікую перагружанасць, якая не дае ім мажлівасці сур'ёзна працаваць над сабой. Яны-ж усяляк вітаюць справу смялейшага высоўвання тэатральнай моладзі.

Вінаваты кіраўнікі тэатра, сярод якіх ёсць людзі, якія моцна трымаюцца за старыя антрэпрэнёрскія традыцыі.

Вінаваты кіраўнікі, якія да гэтага часу не зразумелі задачу, пастаўленую партыяй перад усёй краінай, якая заключаецца ў смялейшым высоўванні моладзі ва ўсіх галінах дзяржаўнай, навуковай і мастацкай дзейнасці.

Выдатны прыклад Вялікага Акадэмічнага ордэна Леніна тэатра СССР, дзе маладыя акторы, якія раней павінны былі годы і нават дзесяцігоддзі чакаць сабе ролі, цяпер смела пачалі вылучацца на выкананне адказнейшых партый і з поспехам з імі спраўляюцца, нічому не навучыў кіраўнікоў нашых тэатраў. Яны паранейшаму арыентуюцца ў спектаклі на адну «яе» альбо «яго», пакідаючы ў баку ўсіх астатніх актораў, гэтыя шкодныя мейерхольдаўскія традыцыі яшчэ жывуць у тэатрах БССР. Уласна кажучы, такая, з дазволу сказаць, «палітыка» вядзецца не толькі ў дачыненні да моладзі, сярод якой ёсць людзі, што на працягу 2—3 год прабыцца ў тэатры нават не паспрабавалі сваіх сіл і пра якіх «апрыорна» заяўляюць, што яны—людзі нядольныя. Такія адносіны існуюць і да вялікай колькасці больш сталых актораў, але якія па той ці іншай прычыне выклікалі няміласць з боку начальства.

Такія адносіны да актора Звездачотава.

Такія-ж адносіны ў тэатры і да маладога рэжысёра Іванова, які на працягу многіх год не можа атрымаць самастойнай работы, такія-ж адносіны і да рэжысёра Сяргейчыка, сур'ёзная работа якога над пастаноўкай «Дзяцей Ванюшына» сустрэла замест падтрымання пагарду і насмешкі гэтых-жа кіраўнікоў тэатра.

Праўда, часта кіраўнікі тэатра, жадаючы апраўдаць сябе і не 'маючы мажлівасці адмаўляць здольнасці моладзі, указваюць, што яна (моладзь) нявопытная і часам не можа справіцца з адказнымі ролямі. Тут-жа прыводзяць прыклады.

Аказваецца, у тэатры вялікім шчасцем лічыцца для некаторых актораў быць другім выканаўцам ролі. Хтоніхто баіцца гэтага другога выканаўца. Таму моладзь выкарыстоўваецца ў якасці другога выканаўца толькі ў экстраных выпадках, напрыклад, у выпадку хваробы асноўнага выканаўца. Тады за два дні малады актор павінен падрыхтаваць ролю. Дзейнічаючы такімі метадамі, кіраўнікі тэатра толькі кампраметуюць маладых актораў.

Моладзь у такіх выпадках зусім правільна патрабуе прызначэння двух выканаўцаў на ўсе асноўныя ролі з умовай, што работа рэжысёра з абодвума выканаўцамі будзе праводзіцца аднолькавая. У мэтах той-жа кампраметацыі моладзі маладому нявопытнаму рэжысёру кіраўнікі тэатра даручаюць пастаноўкі з выканаўцамі выключна з ліку моладзі. У выніку рэжысёр мала чаму навучае гэтых актораў. Бываюць факты бястактнасці ў дачыненні да маладога актора. Так здарылася з Вічфінскім, якому, не ўлічыўшы яго творчых мажлівасцей, даручылі ролю Пятра ў «Мяшчанах», а затым, ужо ў часе рэпетыцый, адабралі яе.

Абураюча дрэнна пастаўлена вучоба маладога актора. У тэатр прыходзяць юнакі і дзяўчаты з надзеяй чаму-небудзь навучыцца. І вось, маладога чалавека, які за 4—5 год мог стаць інжынерам, настаўнікам, урачом, у тэатры нічому не навучаюць, ці працуюць з ім ад выпадку да выпадку, а праз 4—5 год, не выявіўшы яго на рабоце, пачынаюць сумнявацца ў яго здольнасцях і звальняюць з працы.

Адсутнасць работы не дае мажлівасці маладому актору ў поўнай меры праявіць сябе і тым самым узняць свой матэрыяльны ўзровень.

На аснове ўсяго таго, што намі тут сказана пра становішча маладога актора ў тэатры, можа скласціся ілжывае ўяўленне, што моладзь у нас залішне патрабавальная, што яна хоча падмяніць сабою сталых тэатральных майстроў.


Але гэта было-б глыбокай памылкай. Моладзь, наадварот, вельмі цвяроза ўяўляе сабе, што ў тэатр часта трапляюць сапраўды людзі няздольныя, ад якіх тэатру трэба вызваляцца. Але для гэтага іх не трэба марынаваць у тэатры па 4—5 год. За гэты час яны змаглі-б прынесці нямала карысці ў іншых галінах нашага будаўніцтва. У дачыненні-ж да здольных маладых актораў іх патрабаванні зусім законныя і скромныя

«Дайце мажлівасць сістэматычна вучыцца. Дайце мажлівасць хоць адзін раз у год паспрабаваць свае сілы на сур'ёзнай акторскай рабоце».

Дарэчы, ці не час Упраўленню па справах мастацтваў адкрыць даўно чакаемую нашай моладдзю тэатральную школу. Гэта-ж факт, што саматужнікі, аб'яднаныя ў Белпрамсавеце маюць у Менску сваю тэатральную і балетную студыі, а дзяржаўны орган кіраўніцтва мастацтвам — Упраўленне па справах мастацтваў не мае ні той, ні другой.

А. КУЧАР.

АД РЭДАКЦЫІ: Артыкул друкуецца ў парадку абмеркавання. Просім таварышоў рэжысёраў, актораў і працаўнікоў іншых галін мастацтва выказацца на старонках нашай газеты аб рабоце з маладымі акторамі і становішчы моладзі ў іншых галінах мастацтва.



Чырвонаармейскія зацейнікі тт. Астаф'еў і Кулікаў.

Чырвонаармейская самадзейнасць да Першага Мая

Канцэрты чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці, праведзеныя ў дні XX гадавіны РСЧА ў часцях Чырвонай Арміі, ДЧА і, у парадку таварыскага абмену вопытам творчасці, на прадпрыемствах і калгасах, паказалі вялікія мастацкія дасягненні чырвонаармейскіх самадзейных калектываў, салістаў Чырвонай Арміі, чытальнікаў і зацейнікаў.

Зараз часці Беларускай ваеннай акругі рыхтуюцца да вялікага свята пролетарыята—1-га Мая, каб побач з выдатнымі паказчыкамі баявой вучобы сустрэць свята выдатнымі ўзорамі чырвонаармейскай самадзейнасці.

Дзесяткі хораў, ансамбляў, аркестраў, танцавальных калектываў, груп зацейнікаў, дзесяткі тэатральна-драматычных калектываў рыхтуюць новыя праграмы. Канцэрты самадзейнасці ў першамайскія дні будуць паказаны не толькі ў ваенных часцях, але і шырокаму працоўнаму насельніцтву.

У часцях Менскага гарнізона праводзяцца, з ахопам усіх падраздзяленняў, спаборніцтвы на лепшую ротную самадзейнасць. У часці, якой камандуе тав. Багамолаў, арганізаван конкурс лепшых выканаўцаў мастацкіх твораў на тэму: «Шчаслівая радзіма, радаснае жыццё». Вядомая сваёй самадзейнай актыўнасцю і масавым зацейніцтвам часць тав. Рыжака рыхтуе вялікую першамайскую праграму харавых песень, сольных, вакальных выступленняў, парадзістаў-зацейнікаў, частушак з танцамі, совецкай музыкі. Тэатральна-драматычны калектыў гэтай часці рыхтуе да 1-га Мая пастаноўку п'есы «Слава» В. Гусева.

Вядомы аркестр гарманістаў пад кіраваннем тав. Матухненка падрыхтаваў новую праграму песень аб вялікім Сталіне, наркоме Варашылаве і магутнай РСЧА.

Хор баявых падруг — жонак камандзіраў пад кіраваннем тав. Сеўскага, побач з сучаснымі совецкімі песнямі папоўніў свой рэпертуар песнямі з класічных опер.

Беларускі народны ансамбль Менскага ваеннага вучылішча пакажа мантаж беларускіх мелодый песень і танцаў.

Група салістаў вакальнай студыі Менскага ДЧА ў дні 1-га Мая выступіць з новымі творамі совецкіх кампазітараў і з лепшымі творамі рускіх класікаў.

Чытальнікі рыхтуюць рад твораў В. В. Маякоўскага, В. Гусева, Я. Купалы, Я. Коласа і інш.

У першамайскія дні ўпершыню выступіць чырвонаармейскі самадзейны ансамбль песні і танцаў у складзе 120 чалавек, арганізованы пры Менскім Доме Чырвонай Арміі.

Рыхтуюцца дзесяткі новых танцаў, імправізацый. Танцавальны калектыў Менскага ДЧА рыхтуе сюжэтную чырвонаармейскую плясавую сюіту. Да выступленняў у дні 1-га Мая рыхтуецца дзіцячы танцавальны калектыў пры менскім Доме Чырвонай Арміі.

Прывіліся і заваявалі сталае месца ў першых радах мастацкай самадзейнасці калектывы народных інструментаў (домрава-балалаечныя аркестры, балалаечныя ансамблі).

Сотні калектываў мастацкай самадзейнасці, зацейнікаў, чытальнікаў і самадзейных артыстаў Чырвонай Арміі ў дні Першага мая пакажуць сваё мастацтва, прасякнутае любоўю да сваёй радзімы і гатоўнасцю ўступіць у бой за шчасце народаў. Баявой і радаснай песняй любімай Чырвонай Арміі агласяцца прасторы вуліц, плошчаў і шырокіх палёў у дні Першага мая. І песня гэта, як радасць народа, будзе ўтораць грозным словам воінаў-рэвалюцыянераў: «Я сын працоўнага народа», прымаючых у гэты дзень прысягу на вернасць сваёй радзіме, на гатоўнасць памерці за справу соцыялізма.

М. В.

Канцэрт творчых калектываў філармоніі БССР

Беларускае народнае мастацтва, багатае надзвычайнымі ўзорамі народнай творчасці, да гэтага часу яшчэ недастаткова распрацоўваецца і папулярызуецца, вось чаму кожны крок у гэтым напрамку, крок наперад, сам па сабе ўжо становіцца дарагім і прыкметным. Канцэрт Філармоніі 31 сакавіка, у якім удзельнічалі нядаўна арганізаваныя калектывы ансамбля беларускай песні і пляскі (кіраўнікі Сакалоўскі і Алексютовіч) аркестр народных інструментаў (кіраўнік Самохін) з'явіўся не толькі паказам іх работы, але і паказам авалодання імі беларускім народным мастацтвам, нацыянальным па форме і соцыялістычным па зместу. У гэтым-жа канцэрце паказаў свой творчы рост і хор (кіраўнік Бары), які таксама ў аснову сваёй дзейнасці паклаў работу над беларускай народнай песняй. Хор за час свайго існавання прыкметна вырас, узмацніўся, добра гучыць, набыў насычанасць, чыстату інтанацыі і пашырыў свой рэпертуар. У канцэрце ім былі добра выкананы рад народных і масавых песень. Пакінулі прыемнае ўражанне і творы класічнага рэпертуара. Хору ў далейшым побач з работай над песняй неабходна сур'ёзна заняцца буйнай формай, капітальным рэпертуарам, папоўніць і якасна і колькасна склад сваіх партый. Трэба таксама пашыраць і папаўняць рэпертуар беларускай народнай песні, якая ў справаздачным канцэрце была прадстаўлена, нажаль, слаба.

Аркестр народных інструментаў ў гэтым канцэрце ўпершыню па-сапраўднаму паказаў сваю працу. Цымбальны склад аркестра дапаўняюць баяны, дудкі і ліры. Ствараецца характэрнае, арыгінальнае гучанне, непадобнае ні на адзін з відаў народных аркестраў. Неабходна павялічыць аркестр, надаць яму поўнакроўную гучнасць як дубліраваннем ужо маючыхся інструментаў, так і шляхам вынаходніцтва, шуканняў у галіне павелічэння дыяпазону, рэгістаў гучання і г. д. Канцэрт паказаў, што аркестр прарабіў вялікую работу і становіцца на шлях патрэбнага прафесіяналізма. Добра злажана і маляўніча былі выкананы: «Рондо» Самохіна, тры экасэзы Шуберта, «Менуэт» Бакерына і народны беларускі танец «Лявоніха» Туранкова.

Ансамбль беларускай народнай песні і пляскі — вельмі жывы, яркі, тэмпераментны калектыў. І, не гледзячы на тое, што ён яшчэ вельмі малады, можна з упэўненасцю сказаць, што ў яго вялікая будучыня. Выкананне ансамбля падкупляе сваёй непасрэднасцю, свежасцю, маладосцю. Чуеш сапраўднае народнае гучанне песні з усімі характэрнымі асаблівасцямі. Асабліва ўдала ў канцэрце былі выкананы: песня пяці дзяўчат, «Бывайце здаровы» Любана і танцы «Бульба» і «Лявоніха». Філармоніі неабходна пашырыць калектыў, папоўніўшы яго добрымі галасамі — лепшымі ўдзельнікамі калгаснай самадзейнасці, а таксама сур'ёзна заняцца стварэннем рэпертуару і рэжысёрскім афармленнем выступленняў ансамбля.

Н.

АЛІМПІЯДА МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ ТРЫКАТАЖНІКАЎ

Гэтымі днямі закончылася алімпіяда мастацкай самадзейнасці прамысловых тэкстыльна-трыкатажных арцелей, у якой прыняло ўдзел 170 чалавек. Алімпіяда паказала вялікі мастацкі рост работнікаў арцелей.

Асабліва трэба адзначыць выступленні членаў гомельскай арцелі «Гомтэкстыль». Яе харавы і танцавальны калектывы—пад кіраваннем тав. **Кац**—выдатна выканалі рад беларускіх і рускіх народных песень і танцаў, у тым ліку «Калінку» (запявала **Гольдберг**), «Зімушку-зіму» (запявала **Бабкова**), «Юрачку» «Лявоніху» і інш.

Вельмі добры прыём сустрэў калектыў арцелі «Верны шлях» (Шклоў), які выканаў частушкі аб таварышу **Сталіне**.

З вялікім поспехам прадэманстраваў свае дасягненні хор арцелі «Пролетарый» (Ветка), — беларускія народныя песні «Сняжок трасе», «Цыганачку», «Мазурыкі» і «Галю».

Заслужаным поспехам карысталіся выступленні 15-гадовай тав. **Чэрток** з арцелі «Чырвоны Кастрычнік» у Рэчыцы, якая выканала пад уласны акампанімент гітары украінскую песню «Ой, казала мені маты» і «Калыханку» Моцарта, і двух дзяўчынак з Віцебска — **Акунёвай** і **Цырлсон**, якія выканалі лезгінку, польку Рахманінава і венгерскі танец (кіраўнік **Рахліна**).

Трэба яшчэ адзначыць мастацкае чытанне на яўрэйскай мове тав. **Хеймана** з бабруйскай арцелі вяровачнікаў, музыкальныя нумары на мандаліне і домры **Фількенберга**, **Разанава** і **Кофмана** з арцелі «Чырвоны Кастрычнік» у Рэчыцы, мастацкае чытанне **Рубінай** і сясцёр **Рэйзін** з менскай арцелі імя Крупскай.

Лепшыя выканаўцы, а таксама старшыні арцелей і культработнікі прэміраваны на агульную суму 6.000 рублёў.



Плакат работы Н. Дзенісава, В. Праўдзіна, Н. Ватолінай і З. Праўдзінай да надыходзячых выбараў у Верхоўны Совет РСФСР.

ТРЭЦЯЯ УСЕБЕЛАРУСКАЯ АЛІМПІЯДА ПРАМКААПЕРАЦЫІ

17 красавіка ў Менску пачынаецца трэцяя ўсебеларуская алімпіяда самадзейных мастацкіх калектываў прамкааперацыі На алімпіяду чакаецца звыш 400 лепшых выканаўцаў з ліку 7 тысяч улічаных удзельнікаў мастацкай самадзейнасці прамкааперацыі.

У парадку падрыхтоўкі да ўсебеларускай алімпіяды ўпершыню праведзены тры алімпіяды мастацкай самадзейнасці прамысловых саюзаў тарфяных, тэкстыльна-трыкатажных і скураных арцелей. Гэтыя алімпіяды паказалі значны рост якасці работы мастацкіх калектываў (усяго іх па прамысловай кааперацыі БССР налічваецца 310). З ліку лепшых трэба адзначыць хор гомельскай арцелі «Гомтэкстыль» пад кіраваннем тав. Кац, віцебскі танцавальны калектыў пад кіраваннем тав. Райхлінай, віцебскі яўрэйскі драмгурток пад кіраваннем тав. Фішара, бабруйскі домбравы аркестр, шклоўскі калектыў частушачнікаў, гомельскую акрабатычную групу арцелі «Капершлях», веткаўскі жаночы фальклорны хор арцелі вяровачнікаў і інш.

Алесь Стаховіч

У ДАЖДЛІВЫ ДЗЕНЬ

(*Апавяданне*)

У даждлівы і золкі асенні дзень Лёнька з Пецяй затрымаліся ў школе. Хоць і былі яны апрануты ў цёплыя ватовыя паліто, але не хацелася ім мокнуць пад густым дажджом і яны, скончыўшы заняткі, вырашылі яшчэ крыху пачакаць у класе.

Хлапчукі сядзелі на лаўцы, увесь час глядзелі праз запацелыя шыбы вялікіх вакон, па якіх імкліва спашаліся долу невялічкія струменьчыкі, а дождж барабаніў па крышы і на дварэ ўсё больш змяркалася, цямнела.

— Відаць, не перачакаеш яго... — зашпільваючы паліто прамовіў Пеця.— Трэба ісці ўжо, а то цёмна будзе.

Хлапчукі выйшлі з школы і таропка пакрочылі ў напрамку свайго калгаса, будынкі якога віднеліся на ўзгорку за два кілометры ад школы. Наўкола было шэра. Над маўклівымі палямі плылі густыя, цёмныя хмары, спюлзёныя прыкрыя кропелькі казыталі твары хлапчукоў.

Наперадзе спяшаўся Лёнька.

Мінаючы гумны, хлапчукі заўважылі постаць невядомай жанчыны, якая тулілася ля самай сцяны старога хлява.

Чаго яна туліцца тутака?

— А хто-ж яе ведае.

— Мусіць не тутэйшая?

— Ідзе аднекуль. Ад дажджу схавалася...

— Трэба даведацца, — прапанаваў Лёнька.

Хлапчукі звярнулі з канюшынішча і накіраваліся да хлява. У гэты час невядомая жанчына чамусьці пасунулася за вугал. Але Пецька з Лёнькам прыбавілі кроку і хутка прыблізіліся да яе.

Сугорбая, нязграбна апранутая, жанчына была мокрая з ног да галавы. Здавалася, нібы яна толькі-што вылезла з балота. Яе чорная, доўгая спадніца апускалася да самых запэцканых у гразь чаравікаў. Абмусоленая ватоўка была падперазана папружкай. Галава завязана вялікай хусткай, якая закрывала лоб, шчокі і толькі выпуклыя вочы блішчэлі з-пад густых росных брывей.

— Чаго стаіце на холадзе? — запытаўся Лёнька.

— Заплюхалася дужа, пачакаць вырашыла, можа, пераціхне дождж і зноў пайду.

— А далёка яшчэ?

— Далёка, дзеткі, далёка...

— Дык зойдзем да нас! — прапанаваў хлапчук.

— А ўжо... дзякуй за ласку, можа, дабярюся як-небудзь.

— Хадзем. Пагрэецеся, абсушыцеся, гэта-ж...

Жанчына ступіла ўперад, зірнула наўкол.

— Яно-б добра пагрэцца, але-ж у вас, можа, у саміх сямейка не малая, дык і недзе дужа...

— Не-е-е, цётка, хата ў нас вялікая, цёплая... — гаварыў хлапчук.

— А што-ж твой бацька робіць?

— Трактарыстам ён. Ужо другі тыдзень малоціць у Зялёных Лужках.

— І начуе тамака?

— Ага! — адказаў Лёнька.

— Ну, добра, — згадзілася жанчына. — Пойдзем сабе. — І яна следам за Лёнькам рушыла да хаты.

Пераступіўшы парог, жанчына стала ля дзвярэй, варушыла плячыма, пацірала рукамі, бубніла:

— От-жа, прамокла, ажно пальцы адубелі. Скажыце вы, золкота якая... Ці не можна пагрэцца, абсушыцца крыху?...

Лёнькіна маці зірнула на незнаёмую, запыталася:

— Адкуль-жа сама?

— З Гарбуноў іду да сына ў Прасмышчыну, шаўцом ён тамака. Дык вось адведаць надумалася, а тут дзень такі трапіўся, каб ведала, дык не пайшла-б ужо...

— Восень — не лета, — зазначыла гаспадыня. — Угадаць цяжка.

— Ды ўжо-ж, — буркнула незнаёмая, — цяжка ўгадаць. Думалася праясніцца, а яно вунь што...

— Ну, дык пагрэйцеся ў нас.

— А ці не можна на печы, бо дужа ўжо я...

— На печы? Падстаў ён, Ленька, табурэтку, хай сабе грэецца, — дазволіла гаспадыня, а сама зноў пачала ў пэбры замешваць свінням.

Жанчына падышла да ложка і, абапіраючыся рукамі, паволі палезла на печ. Разлёгшыся на цёплай печы, яна ўвесь час глядзела на хату, пільна прыслухоўвалася да гаворкі, але сама на гаворку скупілася.

Увечары, калі Лёнькіна маці запаліла лямпу, хлапчук палез на печ, каб дастаць свае кляновыя паленцы, якія ён сушыў тамака на мадэль самалёта, і пачаў мацаць рукамі ля коміна.

Жанчына заварушылася. У гэты час, зусім нечакана для хлапчука, пад бокам у жанчыны штосьці звенькнула аб печ.

Лёнька насцеражыўся.

Жанчына павярнулася на бок, запыталася:

— Што табе, хлопчык?

— Мне вось тут... — гаварыў Лёнька, а сам прыціскаўся да коміна.

Невядомая зиркнула па печы і з яе галавы спаўзла на плечы хустка.

Хлапчук прыкмеціў зусім незвычайнае для жанчыны. Галава ў яе была лысая, усё адно, як у таго дзеда.

Лёнька спачатку ледзь было не крыкнуў, але зразумеў, што гэтага рабіць нельга. Ён узяў свае паленцы і, быццам нічога не бачыў, не спяшаючыся злез з печы, пастукнуў некалькі разоў малатком па цвічку, затым перайшоў у другі пакой, і ўжо адтуль маўклівым кіўком галавы паклікаў да сябе маці.

Такіх таямнічых рухаў маці яшчэ ніколі не заўважала ад сына, і гэта насцеражыла яе. Яна паставіла на загнет чыгунок і падышла да Лёнькі.

— Мама, — ціхенька шаптаў ён у вуха. — Гэта-ж страшыдла нейкае... Безвалосая яна і штосьці ў яе пад бокам...

Перапалоханая жанчына развяла рукамі.

— Трэба хутчэй суседзяў пакліканць, — прамовіла яна і тут-жа пачала раіцца з Лёнькам.

Каб не кідалася ў вочы, Лёнька прайшоў ціха па хаце, пераклаў у куточак паленцы, упарадачыў кніжкі, потым запытаўся ў маці:

— Можа вады прынесці?

— А калі не лянуешся, дык збегай.

Лёнька надзеў пінжачок, узяў вядро і выйшаў за дзверы. Вядро ён паставіў у сенцах, а сам пабег па хатах да суседзяў.

На дварэ ішоў дождж, было гразка і цёмна, толькі ў хатах мільгалі агні, перасякаючы вуліцу сваімі жоўтымі і вузкімі праменнямі.

Хлапчук спяшаўся. Ён імчаўся па вуліцы, а пад нагамі чмякала гразь, і пырскі разляталіся ў бакі.

— Дзядзя! Дзядзя! — ускочыўшы ў хату, захліпваючыся, лепятаў ён.— У нас... — А ў самога займала ў горле і сэрца тахкала ў грудзях.

Неўзабаве ў хату ўвайшоў шыракаплечы прысадзісты мужчына і, павітаўшыся з гаспадыняй, сеў ля стала.

Ляжаўшая на печы жанчына зірнула на чалавека і непрыкметна пасунулася за комін.

А калі следам за хлапчуком парог пераступіў другі мужчына, а за ім малады рослы хлапец, — жанчына вельмі занепакоілася.

Лёнька хадзіў па хаце. Ён пазіраў то на мужчын, то на печку і ўвесь час хваляваўся.

Гаспадыня (як гэта параіў сусед) наліла ў міску супу, паставіла на стол і пачала клікаць невядомую вячэраць:

— Перакусіце, падсілкуйцеся крыху...

— Не турбуйцеся, галубка, я так азызла, што і есці ані не хочацца. Дзякую вам... — бубніла жанчына, але з печы не злазіла.

— Вы хоць трошкі... — прыставала гаспадыня, тупаючы па хаце.

— Якжа-ж так... — умяшаўся мужчына.

Нарэшце, яна злезла з печы і, тулячы бараду ў ватоўку, падышла да стала.

Мужчыны глянулі на нязграбна апранутую, з захутанай у хустку галавой, жанчыну, ад якой несла балотнай прэллю, і моўчкі пераглянуліся.

Лёнька стаяў ля сцяны.

Заводзячы гаворку пра золкае восеньскае надвор'е ды пра нядобрае падарожжа ў такую пару, мужчыны адзін за другім непрыкметна прыбліжаліся да жанчыны.

Жанчына пачала было сёрбаць пастаўлены на стол суп, а калі мужчыны пачалі круціць цыгаркі, яна скочыла на лаўку і раптам бухнулася ў вакно.

— Стой! Трымай яе!.. — схамянуліся ў хаце.

Прысадзісты мужчына кінуўся да вакна і ўмомант схапіў ўцякаўшую за нагу. Хутка падаспеў другі. Яны тузанулі яе назад і, грымнуўшы на падлогу, уселі на яе.

— А-а-а-а!.. — узрадаваўся Лёнька, здзіраючы з яе галавы хустку.

— Бач ты! Мужчына! Пераапрануўся, гадзіна!..

Абяззброены польскі шпіён, звязаны вяроўкай, ляжаў на падлозе.

Раённыя выстаўкі народнай творчасці

У адпаведнасці з пастановай СНК БССР ад 28 снежня 1937 года па БССР пачата арганізацыя выставак народнай творчасці. Задача выставак—папулярызацыя лепшых узораў народнай творчасці ў шырокіх масах працоўных, выяўленне і выхаванне таленавітых кадраў ва ўсіх галінах народнай творчасці.

У нас ёсць весткі з двух раёнаў — **Магілеўскага** і **Шклоўскага**, дзе гэта работа ўжо разгорнута. У абодвух раёнах выстаўкі прысвячаюцца XVII гадавіне вызвалення БССР ад белапалякаў.

На выстаўках будуць прадстаўлены рысункі (алоўкам), жывапіс (масла), скульптура, графіка, ткацтва, вышыўка, разьба па дрэву, разьба па косці, мастацкія ганчарныя вырабы, народныя музычныя інструменты, інкрустацыя, мазаіка, мастацкія цацкі, пляценне, карункі і г. д.

Пры райвыканкомах створаны выстаўкомы. У Магілеве і Шклове склікаюцца нарады загадчыкаў дамоў соцыялістычнай культуры, культактыва, вышывальшчыц і ткачых. Пытанне аб арганізацыі выставак абгаварваецца на сходах калгаснікаў, калгасніц, на пасяджэннях сельсоветаў.

Лепшыя экспанаты будуць прэміраваны і накіраваны на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Вышаў з друку, разасланы падпісчыкам і паступіў у продаж № 2 журнала «Полымя рэволюцыі».

ЗМЕСТ:

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № 4314.